КУДЫ РУШЫЦЬ ЛІТВА? 5

ПАРАДЫ ПА ЗБОРЫ Ў АДПАЧЫНАК 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЛІПЕНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 143 (29512)

Зярнятка да зярнятка

Фота БелТА.

Збожжа новага ўраджаю з дзевяці раёнаў Віцебшчыны паступае на камбінат хлебапрадуктаў у абласным цэнтры. На ўчарашні дзень прадпрыемства прыняло больш як пяць тысяч тон вытворчага збожжа. Яго якасць на камбінаце кантралюе каманда спецыялістаў, сярод якіх тэхнік-лабарант Дар'я КОСАРАВА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:

«У нас выбудавана цэнтралізаваная сістэма бесперапыннай падрыхтоўкі спецыялістаў творчых прафесій. Па ўсёй краіне дзейнічае больш за 400 дзіцячых школ мастацтваў, дзе займаецца звыш 120 тысяч чалавек, 20 каледжаў, дзе адпаведныя спецыяльнасці атрымлівае амаль 4,9 тысячы маладых людзей, а таксама тры вышэйшыя навучальныя ўстановы, дзе ў агульнай колькасці рыхтуюць каля 4,8 тысячы спецыялістаў. Для нас вельмі важна развіваць уласную культуру, знаходзіць творчых людзей і дапамагаць ім у атрыманні сур'ёзнай адукацыі, а таксама ў далейшай творчай рэалізацыі ў прафесіі».

КАРАТКА

- «Вялікая размова з Прэзідэнтам» адбудзецца 9 жніўня. Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэнецца з журналістамі, прадстаўнікамі грамадскасці, экспертнай і медыйнай супольнасці ў фармаце адкрытай размовы.
- **У Мінску стартаваў новы конкурс эскізных праектаў скульптуры аб адзінстве беларускага народа.**
- Рост экспарту па асноўных прамысловых будматэрыялах у I паўгоддзі перавысіў 25 %.
- **БДУІР падняўся на 307 пазіцый у сусветным рэйтынгу ўніверсітэтаў Webometrics.**
- «Белшына» выпусціць новыя мадэлі шын з палепшанымі характарыстыкамі.
- **Брэзінскі запаведнік распрацаваў эксклюзіўны тур па назіранні за мядзведзямі ў дзікай прыродзе.**
- Георгій Кандрацьеў зацверджаны галоўным трэнерам футбольнай зборнай Беларусі.

ISSN 1990 — 763X

Прыёмная кампанія — 2021

ІТ, МАРКЕТЫНГ, АРХІТЭКТУРА, ДЫЗАЙН...

Якія спецыяльнасці папулярныя сярод абітурыентаў 2021 года?

26 ліпеня ў вышэйшых навучальных установах завяршыўся прыём дакументаў на бюджэтную і платную формы навучання па спецыяльнасцях, дзе прадугледжаны ўступныя іспыты. На два дні пазней завяршыўся прыём дакументаў на бюджэт па аграрных спецыяльнасцях, якія традыцыйна адчуваюць дэфіцыт абітурыентаў. І сёння ў ВНУ падводзяць першыя вынікі прыёмнай кампаніі.

СТАР. 4

Праверка медыцынскіх сіл

Ірына МАЛЁВАНАЯ:

«МЫ ЗАБЯСПЕЧЫМ ВЫРАШЭННЕ ЛЮБОЙ ПРАБЛЕМЫ»

Фота НАК Беларусі.

Алімпійскія гульні ў Токіа стануць выпрабаваннем не толькі для спартсменаў, але і для медыцынскага персаналу. Людзі, якія кожны дзень праяўляюць цуды мужнасці і гераізму ў барацьбе з каранавірусам, выйдуць на новую прыступку сваіх звышздольнасцяў, працуючы ў беспрэцэдэнтных умовах, выкліканых тым жа каранавірусам. Галоўны ўрач беларускай алімпійскай зборнай, дырэктар РНПЦ спорту Ірына Малёваная напярэдадні ад'езду ў Токіа расказала «Звяздзе», чаго медыкі чакаюць ад самай незвычайнай Алімпіяды.

СТАР. 8

На думку парламентарыя

Ігар ГЕДЗІЧ:

«УБАЧЫЦЕ, НІ АДНА ЕЎРАПЕЙСКАЯ СТРУКТУРА НЕ БУДЗЕ АБУРАЦЦА НЕЧАЛАВЕЧЫМІ ЎМОВАМІ, ЯКІЯ СТВОРАНЫ ДЛЯ БЕЖАНЦАЎ У ЛІТВЕ»

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, дырэктар Гродзенскага драматычнага тэатра Ігар Гедзіч падзяліўся са «Звяздой» сваім меркаваннем адносна вырашэння літоўскімі ўладамі пытання па сітуацыі з мігрантамі з Бліжняга Усходу:

— Тое, што мы цяпер назіраем, інакш як парушэннем міжнародных стандартаў і агульначалавечых правілаў маралі і не назавеш. Мы на практыцы бачым рэалізацыю палітыкі двайных стандартаў, якая для Еўропы, на жаль, стала ўжо нормай жыцця. Гэта датычыцца як паводзін у дачыненні да мігрантаў з Бліжняга Усходу, так і да сваіх уласных грамадзян, што выказваюць незадаволенасць дзеяннямі ўлады ў адносінах да вырашэння праблемнага пытання з іншаземцамі. Тыя сродкі ўдушэння пратэстаў, якія выкарыстоўваюцца, сведчаць аб двайных падыходах вельмі выразна. Высновa з гэтага адна: псеўдадэмакратыя, якая навязваецца калектыўным Захадам, прывядзіць да сумных наступстваў. А дзеянні, якія сёння дэманструе літоўская ўлада ў адносінах да мігрантаў і сваіх грамадзян, сведчаць аб тым, што палітычная эліта знаходзіцца ў цэйнт-ноце і дакладна не ведае, якія захады неабходна рабіць для вырашэння балючага пытання па мігрантах. Дастаткова толькі прыгадаць клеткі, што дастаўляюцца ў зону знаходжання бежанцаў, якія даюць выразнае разуменне стаўлення да гэтых людзей: інакш як здзекам над чалавечай годнасцю гэты крок і не назавеш. І вось убачыце, што ні адна з еўрапейскіх краін і структур па абароне правоў чалавека не выкажа абурэння ці нават занепакоенасці нечалавечымі адносінамі ў дачыненні да гэтых няшчасных людзей, якія былі вымушаныя пакінуць сваю радзіму ў пошуках лепшага жыцця. І ніхто не прыгадае, што іх прымусіла стаць бежанцамі. А гэта, дарэчы, — вынік той палітыкі, якую блок НАТА рэалізоўваў у дачыненні да «недэмакратычных» краін, і палітыкі, падтрымваной Еўрапейскім саюзам.

Вольга АНУФРЫЕВА.

Дэпутаты на месцах

Аляксандр АУТКА:

«АСАБЛІВА СУМУЮ ПА ЗЯМЛІ ПАДЧАС ЖНІВА»

Гэтая фраза дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чамусьці асабліва запала ў душу. Мабыць, таму, што ў разгары ўборачная кампанія, да таго ж наша размова вялася ў будучай сталіцы «Дажына» на Гродзеншчыне — горадзе-спадарожніку Скідзелі. Дарэчы, і сам Аляксандр Аутка родам з гэтых мясцін, яго родная вёска Гліняны за некалькі кіламетраў ад Скідзеля. Так супала, што менавіта тут ён правёў свой нядаўні прыём грамадзян. Такім чынам удалося не толькі распытаць дэпутата аб яго парламенцкай дзейнасці, але і ўбачыць работу парламентарыя са сваімі выбаршчыкамі.

«ГДЕ ЭТА УЛИЦА, ГДЕ ЭТОТ ДОМ...»

Радок з вядомай песні як найлепш пасуе да тэматыкі зваротаў скідзельчан. Тут ёсць пытанне і па якасці дарогі, і па стане дома. Такія праблемы паўстаюць вельмі часта падчас прыёмаў. Гэтым разам дарожнае пытанне ўзняла індывідуальны прадпрымальнік Марына Рамановіч. Жанчыну турбуе стан дарогі ў весцы Некрашы. Яна звярнула ўвагу на заезд, на якім часта буксуюць аўтамабілі, асабліва ўвосень і вясной. Звярталася неаднаразова да старшыні сельскага выканкама. Аналагічная сітуацыя з заездам існуе і на дарозе да дачнага пасёлка. Там часта ставяць аўтамабілі, што перашкаджае руху. Разам з тым, установіўка знака не прадугледжана.

— Там невялікая тэрыторыя. Усяго метраў дзесяць, а праблема цягнецца даволі даўно. Мы з вяскоўцамі неаднаразова сваімі сіламі яе раўнялі, падсыпалі, але там патрэбны больш трывалы грунт, бо пры дажджы ні праехаць, ні прайсці. Праз некалькі дзён ізноў балота стаіць. Мы гатовыя самі правесці работы, калі будзе выдзелена хоць бы машына асфальтавай крошкі, — прапануе Марына выхад з сітуацыі.

Пенсіянерка са Скідзеля Людміла Кавалёва прыйшла з праблемай дома па вуліцы Клубнай. Па яе словах, жыхары просяць, каб дом перадалі на баланс ЖКГ. У цяперашні момант ён на абслугоўванні мясцовай сельгаспадаркі. Пытанне цягнецца ўжо не адно дзесяцігоддзе. Дом патрабуе капітальнага рамонту, але гаспадарка не можа забяспечыць работы. Заявы ад жыхароў накіраваны ў райвыканкам. У Скідзельскім гарадскім выканкаме патлумачылі, што адносна перадачы дома будзе створана спецыяльная камісія, якая даследуе яго стан. Калі ўсе заўвагі будуць выпраўленыя ўласнікамі дома, тады яго зможа прыняць іншы бок, у дадзеным выпадку ЖКГ. Вось толькі аб'ём работ даволі значны і фінансава затратны. Таму пытанне, на думку жыхароў, можа зацягнуцца надоўга. А між тым, старая электраправодка і дрэнныя ўмовы эксплуатацыі могуць прывесці да непажаданых наступстваў, папярэджвае пенсіянерка.

— Людзі прыходзяць са сваімі клопатамі і чакаюць падтрымкі. І гэтыя пытанні не такія ўжо невырашальныя, — упэўнены Аляксандр Аутка. — Як, напрыклад, тая ж дарожная праблема, якая ўзнята жыхаркай Скідзеля. Сапраўды, палепшыць заезд даўжынёй 7-10 метраў — не такая і складаная справа, але яна чамусьці цягнецца з году ў год. Таму пытанне будзе вырашацца з удзелам старшыні сельвыканкама і дарожнай арганізацыі.

Больш складаным бачыцца дэпутату пытанне аб перадачы дома на баланс ЖКГ. Такіх дамоў нямала. Патрабаванні жыхароў зразумелыя: жыллёва-камунальная гаспадарка — гэта спецыялізаваная ўстанова, якая павінна займацца добраўпарадкаваннем жылога фонду. Але камунальнікі пры перадачы дома ставяць даволі шмат умоў, якія ўласнік — сельгаспрадпрыемства — не здольнае выканаць з-за высокай фінансавай нагрузкі. Па гэтым пытанні дэпутат звернецца да кіраўніцтва раёна і возьме на кантроль праблему.

Аляксандр Аутка заўважае, што за апошнія дзесяць гадоў у Скідзелі зроблена вельмі многае. Горад цалкам абнавіўся, і гараджане задаволеныя тэмпамі яго добраўпарадкавання. Пракладзены новыя дарогі, у многіх прыватных дамах да 500-годдзя горада памянялі дахі. Цяпер трэба ісці ўглыб, лічыць дэпутат. Гэта значыць, больш уважліва прыглядацца да тых праблем, якія не здаюцца глабальнымі, але непакояць людзей.

— Формы работы розныя. Гэта і прыём грамадзян, і прамыя лініі, і сустрэчы з працоўнымі калектывамі, — расказвае дэпутат. — У маёй выбарчай акрузе тры раёны — Гродзенскі, Свіслацкі і Берастаўіцкі Большасць выбаршчыкаў — сельскія жыхары. Важна, каб яны атрымалі рэальную дапамогу.

«МОЙ ЛЁС — ГЭТА ЗЯМЛЯ І ПРАЦА НА ЁЙ»

Дэпутат прызнаўся, што часам яму вельмі не хапае гарачых дзянькоў у полі. Асабліва падчас пасяўной і ўборачнай кампаній. Вось і сёння ён цікавіцца ходам жніва ў сваіх раёнах. Вядома, у першую чаргу сочыць за работай агракамбіната «Скідзельскі», дзе да парламенцкай дзейнасці працаваў першым намеснікам генеральнага дырэктара. У склад холдынга ўваходзяць пяць гаспадарак. Цяпер у агракамбіната складаны перыяд, але сюды нядаўна прыйшоў новы генеральны дырэктар і людзі спадзяюцца, што справы палепшацца. На гэта скіраваны і намаганні працоўнага калектыву.

У душы Аляксандр Аутка застаецца аграрнікам і марыць вярнуцца да практычнай работы ў сферы АПК. Дарэчы, па магчымасці імкнецца прапагандаваць самы перадавы вопыт раслінаводства, які адлюстраваны ў новым зборніку «Навуковыя асновы тэхналогій вырошчвання азімых збожжавых культур, рапсу і кукурузы». Кніга

падрыхтавана НАН і Мінсельгасхарчам пад рэдакцыяй Ф. Прывалава і А. Ауткі. Аказваецца, вядомы навуковец, прафесар Аляксандр Аутка — не толькі цёзка дэпутата, але і яго родны дзядзька. У падыходзе да работы ў сельскай гаспадарцы яны, можна сказаць, аднадумцы.

— Зямля любіць гаспадара, гэта галоўнае. Але ад зямлі трэба не толькі забіраць, але і аддаваць ёй. Сёння глабальная праблема ў пацяпленні клімату, з'явіліся сухавеі, глебу проста выдзімае, і гэта вынік таго, што сталі ўносіць значна менш арганічных угнаенняў. Мы захапіліся мінеральнымі ўгнаенні, пестыцыдамі. А зямля — жывы арганізм, і ёй патрэбна адпаведнае харчаванне. Тады і людзі будуць здаравейшыя, — выказаў сваю пазіцыю дэпутат Аутка.

Ён лічыць, што добрым крокам да пераходу на новыя рэйкі можа стаць арганічнае земляробства. Магчыма, многія сельгаспрадпрыемствы наўрад ці могуць пайсці па такім шляху з-за падзення валавой вытворчасці. Пакуль гэтым займаюцца толькі фермерскія гаспадаркі. Але ёсць і сельгаскааператывы, якія паспяхова асвойваюць экалагічнае земляробства, напрыклад, у Берастаўіцкім раёне. А ў Мінску з'явіўся і рынак арганічнай прадукцыі. Такія фермерскія аддзелы ўжо прысутнічаюць і ў гандлёвых сетках. Ёсць і закон аб арганічным земляробстве. Але для далейшага развіцця дадзенага кірунку необходна мець сваю акрэдытаваную лабараторыю. Бо цяпер адпаведны сертыфікат можна атрымаць толькі за мяжой.

Прафесіянальны аграрый не хавае сваёй занепакоенасці наконт недахопу кваліфікаваных кадраў. На яго думку, гарадскія хлопцы, якія вучацца ў аграрных ВНУ, наўрад ці будуць працаваць на зямлі. Лепш рабіць стаўку на тых, хто на ёй вырас, з дзяцінства знаёмы з гэтай работай, мэтанакіравана паступае ў аграклас.

Увогуле, кіраўнікі сельгаспрадпрыемстваў не павінны чакаць, пакуль да іх размяркуюць выпускнікоў ВНУ, варта самім шукаць будучыя кадры яшчэ ў школе. Пагаварыць, у тым ліку і з бацькамі падлеткаў. Не сакрэт, што многія хочуць бачыць сваіх дзяцей праграмістамі, урачамі, педагогамі ці менеджарамі па турызме. І гэта добра. Між тым, работа ў сферы АПК мае нямала бонусаў. Напрыклад, гаспадарка гатовая прызначыць сваім будучым маладым спецыялістам стыпендыю падчас вучобы, а потым даць жыллё і нядрэнны заробак. І чалавек будзе працаваць, упэўнены дэпутат. Трэба рыхтаваць кадры самім, не чакаючы, пакуль нехта дасць гатовыя. У Скідзелі, напрыклад, ёсць сельскагаспадарчы каледж. Сюды прыязджаюць кіраўнікі Гродзенскага раёна, працуюць з навучэнцамі. У прыватнасці, так робіць старшыня СВК «Азёры» Гродзенскага раёна Аляксандр Шышко, член Савета Рэспублікі.

У ДАПАМОГУ — КОСМАС

Аляксандр Аутка — дэпутат, як кажуць, ад зямлі. Таму і яго дзейнасць у парламенце звязана з АПК — ён намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы. За перыяд работы сёмага склікання парламента адбылося пяць сесій, дзе разгледжана некалькі законапраектаў у сельскагаспадарчай галіне. У прыватнасці, «Аб селекцыі і насенняводстве сельскагаспадарчых раслін». Закон будзе рэгуляваць і дзейнасць арганізацый, якія займаюцца дадзенай справай. Бо не ўсе прадаўцы прапануюць якасны насенны матэрыял, адпаведна, пагаршаецца ўраджайнасць. Зразумела, што колькасць такіх прадаўцоў зменшыцца.

Парламентарыі распрацавалі законапраекты «Аб ветэрынарнай дзейнасці», «Аб племянной жывёлагадоўлі». Разгледжаны праект закона аб ідэнтыфікацыі жывёл. Ён будзе распаўсюджвацца на ўсе віды, у тым ліку на рыб і пчол. Кожны, хто купляе прадукцыю, па штрых-кодзе зможа прасачыць увесь яе шлях. Гэта асабліва важна для экспартных паставак.

Цяпер Камісія працуе над законапраектам «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб геадэзічнай і картаграфічнай дзейнасці». Папраўкі неабходна ўнесці з-за таго, што ў гэтай сферы адбылося шмат змен. Закон павінен упарадкаваць адносіны паміж землекарыстальнікамі. Граніцы зямельных участкаў можна пракласці вельмі дакладна з дапамогай лічбавых тэхналогій, даных, якія атрыманыя праз касмічныя спадарожнікі. У хуткім часе мяркуецца пачаць разгляд Кодэкса аб зямлі.

Што датычыцца асабістага лёсу, дэпутат не бярэцца загадваць наперад, тэрмін паўнамоцтваў дэпутатаў ніжняй палаты парламента сёмага склікання завяршаецца ў канцы 2023 года. Але адно для Аляксандра Ауткі відавочнае — гэта работа на зямлі. Магчыма, і з дэпутацкімі паўнамоцтвамі — у раённым ці абласным Савеце. Такі вопыт у яго таксама ёсць.

Маргарыта УШКЕВІЧ,

г. Скідзель.

Фота з архіва героя.

Стагоддзе і пяць гадоў Васіля Мічурына

Герою Савецкага Саюза Васілю МІЧУРЫНУ ўчора споўнілася 105 гадоў. Віншавальнае пасланне і падарункі ад Прэзідэнта Беларусі з нагоды выдатнага юбілею ветэрану ўручыў начальнік Генеральнага штаба Узброеных Сіл — першы намеснік міністра абароны генерал-маёр Віктар Гулевіч, паведамляе БелТА.

Шматлікія віншаванні Васіль Сяргеевіч прымае сёння ў асноўным дыстанцыйна. Пасля паспяхова перанесенай аперацыі ветэран знаходзіцца ў доме-інтэрнаце «Камфортнае жыццё», дзе яму забяспечаны пастаянны прафесійны догляд.

Улічваючы ўзрост, стан здароўя і эпідэмічную абстаноўку, маштабнага святкавання юбіляр не арганізоўваў і гасцей не склікаў. Але быў рады і расчулены, атрымаўшы ў свой дзень нараджэння асабіста ад начальніка Генштаба віншавальнае пасланне кіраўніка дзяржавы, кветкі і падарункі.

«Вы маяк для ўсіх ваеннаслужачых, для ўсіх грамадзян нашай краіны, сімвал мэтанакіраванасці да абароны краіны, патрыятызму», — падкрэсліў Віктар Гулевіч, віншуючы Героя.

«Я жыву. І жыць хочацца», — з усмешкай сказаў гасцям Васіль Сяргеевіч.

Памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны Леанід Касінскі ў размове з журналістамі расказаў, што для ваеннаслужачых, ды і для ўсёй краіны, Васіль Мічурын — асоба без перабольшання легендарная: званне Героя Савецкага Саюза ён атрымаў у 24 гады ў Савецка-фінляндскай вайне, прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну. «Цяжка знайсці іншага такога легендарнага чалавека (у Беларусі. — **Заўв. БелТА**)», — лічыць Леанід Касінскі. У пасляваенны час Васіль Мічурын разам з іншымі аднаўляў разбураную Беларусь, працаваў, гадаваў дзяцей, унукаў. «Мы часта сустракаемся з Васілём Сяргеевічам, і яшчэ літаральна два гады таму ён кожны вечар рабіў 30-40-хвілінныя шпацыры», — адзначыў прадстаўнік Мінабароны.

Міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына Касцевіч таксама была сярод тых, хто сёння прыехаў павіншаваць легендарнага ветэрана. У размове з журналістамі яна звярнула ўвагу, што лічыць Васіля Мічурына двойчы Героем — за заслугі ў ваенны і ў мірны час. «Гэты чалавек прайшоў дзве вайны, для нас ён узор мужнасці і гераізму, — сказала яна. — Ён усё сваё жыццё аднаўляў краіну пасля вайны, ён цудоўны бацька, дзядуля і прадзядуля, і ён наш доўгажыхар».

«Ён любіць жыццё, любіць краіну і людзей, якія ў гэтай краіне. Яго пазітыў, настрой і гумар пацвярджаюць, што кожнаму з нас сапраўды трэба арыентавацца на такога пазітыўнага па жыцці чалавека», — дадала Ірына Касцевіч.

Яна падкрэсліла, што ў Беларусі на ўсіх узроўнях цэняць і шануюць ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. «На жаль, іх з кожным годам усё менш, самым старэйшым — ужо за сто гадоў, самым маладым — за 90. З боку дзяржавы ім аказваецца адпаведная значная падтрымка: бясплатнае лекавае забеспячэнне, санаторна-курортнае аздараўленне, пражыванне ў дамах-інтэрнатах, — сказала міністр. — Мерапрыемствы, якія праводзяцца ў краіне, накіраваны на тое, каб аддаць даніну павагі тым людзям, якія забяспечылі нам гэта шчаслівае жыццё. І прыняты некалькі дзён таму ўказ кіраўніка дзяржавы аб тым, што цяпер аднаразовая матэрыяльная дапамога будзе выплачвацца штогод ветэранам Вялікай Айчыннай вайны і асобам, якія пацярпелі ад наступстваў вайны, — гэта яшчэ адно пацвярджэнне, наколькі мы ўдзячны гэтым людзям за наша жыццё».

Фота агенцтва «Вайр».

Як расказалі ў Міністэрстве абароны, Васіль Мічурын удзельнічаў у Савецка-фінляндскай і Вялікай Айчыннай войнах з першага да апошняга іх дня.

Звання Героя Савецкага Саюза ўдастоены за подзвіг у баі на Карэльскім перашыйку ў пачатку лютага 1940 года. Тады яму было 24 гады. У жніўні 1940-га ён стаў курсантам Мінскага ваенна-палітычнага вучылішча. Вялікая Айчынная вайна застала яго пад беларускай сталіцай. Франтавымі дарогамі, змагаючыся з ворагам, ён дайшоў да Чэхаславакіі. Удзельнічаў у абароне Мінска, Магілёва, браў Кёнігсберг і Берлін. Дарагой цаной даліся яму баявыя ўзнагароды — два ордэны Чырвонай Зоркі, ордэны Айчыннай вайны I і II ступені, медаль «За баявыя заслугі» пры вызваленні Гомеля і Слуцка, Баранавіч і Брэста. За вызваленне Варшавы і баі ва Усходняй Прусіі ён атрымаў другі ордэн Айчыннай вайны II ступені.

Сёння ў Беларусі засталіся два Героі Савецкага Саюза — Васіль Сяргеевіч Мічурын і Іван Ільіч Кустаў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кіраўнікі Паўночнай і Паўднёвай Карэі аднавілі прамую тэлефонную сувязь

Мун Чжэ Ін і Кім Чэн Ын аднавілі тэлефонную «гарачую» лінію прамой сувязі, абарваную па ініцыятыве Пхеньяна ў чэрвені мінулага года. З таго часу паміж афіцыйнымі асобамі дзвюх краін не было ніякіх зносін. Прадстаўнікі дзвюх краін правялі пробную размову, якая доўжылася тры хвіліны, паведаміла паўднёвакарэйскае Міністэрства па пытаннях уз'яднання. Паўднёвакарэйскі чыноўнік пачаў гутарку са слоў: «Мы рады размаўляць з вамі зноў пасля больш чым гадавога перапынку. Спадзяёмся, што гэта добрая навіна для ўсіх карэйцаў». Як заявіў офіс прэзідэнта Паўднёвай Карэі, Мун Чжэ Ін і Кім Чэн Ын дамовіліся аднавіць давер і палепшыць адносіны. Пачынаючы з красавіка, яны абменяліся некалькімі асабістымі пасланнямі, паведамілі ў Сеуле. «Вышэйшыя кіраўнікі пагадзіліся зрабіць вялікі рывок да аднаўлення ўзаемнага даверу і прымірэння», — адзначаецца ў заяве паўночнакарэйскага дзяржаўнага інфармагенцтва ЦТАК. Праверка сувязі будзе праводзіцца штодня.

У Ватыкане пачаўся суд над кардыналам, якога абвінавачваюць у растраце 350 млн еўра



73-гадовы кардынал Джавані Анджэла Бечу стаў самым высокапастаўленым святаром у найноўшай гісторыі каталіцкай царквы, якія трапілі пад суд за меркаваныя фінансавыя злачынствы. Разам з групай саўдзельнікаў ён абвінавачваецца ў растраце 350 мільёнаў еўра, у тым ліку на куплю нерухомасці ў фешэнэбельным лонданскім раёне Чэлсі. Таксама кардынала абвінавачваюць у тым, што ён незаконна дапамагаў грашыма царквы фірмам і дабрачынным арганізацыям сваіх братоў на іх роднай Сардзініі. Акрамя Бечу, на лаве падсудных апынуліся яшчэ дзевяць чалавек. Іх абвінавачваюць у крадзяжах, вымагальніцтве, адмыванні грошай і злоўжыванні службовым становішчам. У верасні, калі стала вядома пра вынікі расследавання гэтай здзелкі, Папа Рымскі звольніў кардынала з пасады — той загадваў ахвяраваннямі ў фінансавым сакратарыяце Ватыкана. «Я лічу, што гэты суд стане паваротным пунктам і павысіць давер да Святога прастола ў фінансавай сферы. Сам факт суда сведчыць, што ўнутраны кантроль працуе. Справа ініцыіравана знутры Ватыкана», — сказаў кіраўнік эканамічнага сакратарыята Ватыкана Хуан Антоніа Герэра афіцыйнаму інтэрнэт-выданню Vatican News. Мяркуецца, што суд зацягнецца на месяцы — пасля першага, тэхнічнага пасяджэння ён будзе адкладзены да кастрычніка.

У Шры-Ланцы знайшлі найбуйнейшае ў свеце скапленне сапфіраў

Улады Шры-Ланкі паведамілі, што ў краіне быў выпадкова знойдзены фрагмент пароды з найбуйнейшым у свеце скапленнем зорчатых сапфіраў. Вага выяўленых камянёў складае 510 кілаграмаў, або звыш 2,5 мільёна каратаў, а ацэначны кошт — 100 млн долараў. Сапфіры знайшлі ў багатай на мінералы акрузе Ратнапура, на задняім двары дома гандляра каштоўнымі камянямі. Гэты чалавек не пажадаў раскрываць сваё поўнае імя і дакладнае месцазнаходжанне свайго дома з меркаванняў бяспекі. Паведамляецца толькі, што рабочы капаў яму для студні і наткнуўся на вялікую колькасць бледна-блакітных камянёў.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

«ЛІЦЕЙНАЯ ВЫТВОРЧАСЦЬ ПРАЦУЕ Ў ШТАТНЫМ РЭЖЫМЕ»

Днямі ў інтэрнэце распаўсюдзілася інфармацыя, што на Мінскім трактарным заводзе спынілася вытворчасць аднаго з цэхаў. Галоўны металург МТЗ Ілья ФІРСАЎ назваў гэтую навіну няпраўдай.

— Ліцейная вытворчасць як працавала, так і працуе ў штатным рэжыме. Усімі загатовачнымі матэрыяламі забяспечаны ў поўным аб'ёме. Інфармацыя, якая распаўсюджваецца ў інтэрнэце пра тое, што на заводзе нібыта спынены цэх, — фэйк. Людзі, якія працуюць тут, у прыватнасці, на ліцейнай вытворчасці, выдатна ведаюць, што гэта так.

Ілья Фірсаў дадаў, што ў бягучы момант у ліцейным цэху № 2 вядзецца мадэрнізацыя. «Ужо ўстаноўлены і працуюць тры невялікія індукцыйныя печы, і да лістапада плануецца запусціць яшчэ дзве вялікія печы. Такім чынам Мінскі трактарны завод у ліцейным цэху № 2 сыдзе ад выкарыстання коксу і пяройдзе да індукцыйнага плаўлення. Гэта значна павысіць прадукцыйнасць цэха, а таксама палепшыць экалагічную абстаноўку ў горадзе».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

ШТО ВІНЕН, АДДАЦЬ ПАВІНЕН

Гродзенец праз 22 гады знайшоў пазыковую распіску на 40 тысяч долараў ЗША і звярнуўся ў міліцыю, каб вярнуць грошы.

Гісторыя цягнецца з 1999 года. Менавіта тады гродзенец пазычыў 28 тысяч долараў ЗША, пра што атрымаў адпаведную распіску. Праз год прасіцель зноў звярнуўся з аналагічнай просьбай. Гэтым разам сума склала 12 тысяч долараў. У распісцы быў зроблены дапаўняльны запіс аб новай суме. Такім чынам, агульная пазыка склала 40 тысяч амерыканскіх долараў. Тэрмін вяртання грошай не агаворваўся.

Праз тры гады гродзенец запатрабаваў вярнуць узятыя пад распіску грошы. Але даўжнік адмовіўся выканаць свае абавязацельствы, да таго ж і распіска прапала. Дадзеная акалічнасць не дазволіла мужчыну звярнуцца ў праваахоўныя органы.

Толькі сёлета, праз 22 гады, распіску нарэшце ўдалося знайсці. Мужчына звярнуўся ў Ленінскі РАУС Гродна, дзе была прызначана экспертыза почырку.

Аказалася, што ўстанавіць ідэнтычнасць почырку праз працяглы час даволі складана. Па словах старшага судовага эксперта Гродзенскага міжраённага аддзела ДКСЭ Пятра Баўсюка асаблівасці почырку аднаго і таго ж чалавека на працягу яго жыцця могуць мяняцца. У адных гэтыя змены нязначныя і звязаныя са спрашчэннем пабудовы слоў — змяншэннем памеру літар, змяненнем нахілу, парушэннем стройнасці і г. д. А вось у іншых людзей змены ў почырку могуць быць даволі істотныя. Гэта бывае звязана з нейкімі сур'ёзнымі захворваннямі, траўмамі, старэннем арганізма. Іншым разам, заўважае эксперт, змены настолькі значныя, што нават робяць немагчымым правядзенне такой экспертызы.

У дадзеным выпадку ўсё ж удалося ўстанавіць, што распіска, атрыманая 22 гады таму, належыць менавіта даўжніку. Па дадзеным факце вядзецца праверка.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

ЛІЧБАВІЗАЦЫЯ ДЛЯ ГОРНЫХ РАБОТ

Унікальнае праграмнае забеспячэнне для прадпрыемстваў горназдабываючай прамысловасці распрацавалі ў БДУ.

У склад навуковага калектыву ўвайшлі супрацоўнікі механіка-матэматычнага факультэта Белдзяржуніверсітэта пад кіраўніцтвам загадчыка кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі Міхаіла Жураўкова.

Інавацыя ўяўляе з сябе карпаратыўную камп'ютарную сістэму для вырашэння шырокага спектру вытворчых задач, кіравання горнымі работамі і стварэння спецыялізаваных баз даных. У прыватнасці, сховішча ўключае горна-геалагічныя, горнатэхнічныя, геафізічныя, гідрагеалагічныя і іншыя інфармацыйныя блокі.

Больш за 300 супрацоўнікаў можа працаваць адначасова над рознымі задачамі: ствараць тэматычныя лічбавыя карты, выкарыстоўваць графічны рэдактар, мадэляваць аб'екты, а таксама выкарыстоўваць вынікі работы калег.

Прадстаўленая сістэма істотным чынам аўтаматызуе работу спецыялістаў бюро праектавання горных работ, работнікаў геолага-маркшэйдэрскіх службаў, горных інжынераў, начальнікаў горных участкаў і іншых спецыялістаў рудніковў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ІТ, МАРКЕТЫНГ, АРХІТЭКТУРА, ДЫЗАЙН...

НА ФМА — ДРУГІ АБСАЛЮТНЫ РЭКОРД

У Беларускім дзяржаўным універсітэце на дзённую бюджэтную форму навучання пададзены 3142 заявы ад абітурыентаў пры плане прыёму — 2199. Сярэдні конкурс па ВНУ склаў 1,43 чалавека на месца.

Сярод тых, хто падаў дакументы, — 75 пераможцаў міжнародных і рэспубліканскіх алімпіяд. Яны залічваюцца ў студэнты без экзаменаў.

Скончылі сярэднюю школу з медалём альбо сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы з дыпломам з адзнакай 804 абітурыенты (гэта кожны чацвёрты).

Выпускнікоў ліцэяў і гімназій сярод тых, хто падаў дакументы, — 1474 чалавекі, што складае 47 працэнтаў ад агульнай колькасці.

Колькасць абітурыентаў, якія ўдзельнічаюць у агульным конкурсе і маюць сумарны бал вышэй за 300, — 69,2 працэнта. Стабальныя сертыфікаты ЦТ маюць 92 абітурыенты. А на факультэт міжнародных адносін (ФМА) падала дакументы абсалютная рэкардсменка па балах. Выпускніца Ліцэя БДУ Анастасія Савасцёнак набрала 400 балаў з 400 магчымых: у «максімум» увайшлі вынікі ЦТ па беларускай і англійскай мовах, сярэдні бал атэстата і 100 балаў за перамогу на рэспубліканскай алімпіядзе па грамадазнаўстве. У гісторыі прыёмных кампаній у нашай краіне гэта другі выпадак максімальных балаў у абітурыента. У першым выпадку абітурыентка таксама выбрала факультэт міжнародных адносін БДУ.

Рэкордны бал прыёмнай кампаніі ў БДУІР — 396. Такую планку ўстанавіла абітурыентка з Пінска Вікторыя Лазюк. Яна падала дакументы на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій». Вікторыя набрала максімум на ЦТ па рускай мове і матэматыцы. Фізіку здала на 96 балаў. А ў атэстаце ў яе адны «дзясяткі».

На спецыяльнасцях, па якіх праводзяцца ўнутраныя выпрабаванні, склаліся наступныя конкурсы: «дызайн» (напрамак — камунікатыўны) — 12 чалавек на месца пры плане прыёму — 6; «дызайн» (напрамак — дызайн прадметна-прасторавага асяроддзя) — 7,5 чалавека на месца пры плане прыёму — 6; «правазнаўства» (на скарочаную форму) — 3,2 чалавека на месца пры плане прыёму — 10.

На завочную бюджэтную форму навучання падалі дакументы 404 абітурыенты пры плане прыёму 231 чалавек, такім чынам конкурс склаў 1,75 чалавека на месца. У тым ліку на скарочаны тэрмін навучання падалі дакументы 223 абітурыенты пры плане прыёму 70 (конкурс — 3,2 чалавека на месца).

На спецыяльнасцях, па якіх праводзяцца ўнутраныя выпрабаванні, самы высокі конкурс назіраецца на наступных: «медыцынская экалогія» (скарочаны тэрмін навучання) — 7,8 чалавека на месца пры плане — 5; «правазнаўства» (скарочаны тэрмін навучання) — 2,5 чалавека на месца пры плане — 30; «сацыяльная работа» (скарочаны тэрмін навучання) — 4 чалавекі на месца пры плане — 4; «менеджмент» (скарочаны тэрмін навучання) — 3,7 чалавека на месца пры плане — 7; «фінансы і крэдыт» (скарочаны тэрмін навучання) — 2,3 чалавека на месца пры плане — 7; «дакументазнаўства» (скарочаны тэрмін навучання) — 2,4 чалавека на месца пры плане — 12.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

МАКСІМУМ У БДУІР — 396 БАЛАЎ

У Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі на дзённую бюджэтную форму навучання пададзена 1909 заяў, што на 58,8 працэнта перавышае план прыёму (1123). На тэхніка-тэхналагічны профіль паступіла 1781 заява пры плане прыёму 1093. На 30 бюджэтных месцаў па інжынерна-эканамічных спецыяльнасцях хочуць паступіць 128 абітурыентаў. На ваенны факультэт падалі 75 заяў (план прыёму — 89).

Рэкордны бал прыёмнай кампаніі ў БДУІР — 396. Такую планку ўстанавіла абітурыентка з Пінска Вікторыя Лазюк. Яна падала дакументы на факультэт камп'ютарных сістэм і сетак на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій». Вікторыя набрала максімум на ЦТ па рускай мове і матэматыцы. Фізіку здала на 96 балаў. А ў атэстаце ў яе адны «дзясяткі».

Варта нагадаць, што абітурыенты БДУІР маюць магчымасць пры падачы заявы ў прыёмную камісію выбіраць і расстаўляць свае прыярытэты. У спісе, з якога яны выбіраюць, — 34 спецыяльнасці. Калі абітурыент не праходзіць па сваіх балах на першую ўпадабаную спецыяльнасць, згаданую ў прыярытэтах, то ўдзельнічае ў конкурсе на другую, трэцюю і гэтак далей. Прычым пры падачы дакументаў можа падаць адразу дзве заявы: на бюджэтную і платную формы навучання. Пры гэтым пералік спецыяльнасцяў, іх колькасць і прыярытэты могуць быць розныя для дзвюх заяў. У выпадку непаступлення на бюджэт заява абітурыента будзе ўлічана ў конкурсе на платную форму навучання, што не запатрабуе дадатковага візіту ў прыёмную камісію.

Самай папулярнай сярод абітурыентаў стала спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак. На першым месцы ў заяве яе ўказалі 332 чалавекі (пры плане прыёму — 60). На другім месцы — «інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі (у гульнявой індустрыі)» на факультэце інфармацыйных тэхналогій і кіравання — 150 заяў на 15 бюджэтных месцаў. Замыкае тройку рэйтынгу папулярнасці — «інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» (ФКСіС) — 147 ахвотных на 65 бюджэтных месцаў.

На дзённую бюджэтную скарочаную форму навучання падалі дакументы 28 абітурыентаў пры плане набору — 24. На завочную бюджэтную форму прынята 48 заяў на 38 месцаў. На завочнай бюджэтнай скарочанай форме 5 месцаў, а жадаючых паступіць — 52 (!).

Пасяджэнне прыёмнай камісіі, на якой адбудзецца залічэнне на бюджэтную дзённую і завочную формы атрымання адукацыі, акрамя скарочанай, пройдзе 30 ліпеня. Пратакол аб залічэнні будзе апублікаваны на сайце. У электронным кабінеце абітурыента таксама з'явіцца інфармацыя аб тым, на якую спецыяльнасць той прайшоў.

Прыём дакументаў на платную форму навучання працягваецца. Сёння на 1042 платныя месцы пададзена 485 заяў. Пакуль што ліdзіруе тая ж спецыяльнасць, што і ў бюджэтнікаў — «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — (92 заявы пры плане набору 60). Попытам карыстаюцца спецыяльнасці эканамічнага профілю — «электронны маркетынг» і «эканоміка электроннага бізнесу». На іх запоўнена ўжо больш за палову месцаў.

НАСТАЎНІК У ПЯТЫМ ПАКАЛЕННІ

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце на асобныя спецыяльнасці прахадныя балы выраслі на 18 пунктаў. На думку рэктара Аляксандра ЖУКА, прыёмная кампанія 2021 года для ўніверсітэта больш паспяховая за леташнюю: «Усяго было пададзена звыш 2280 заяў, гэта больш, чым летась. Акрамя таго, павялічылася сярод абітурыентаў колькасць выпускнікоў педагагічных класаў. Гэта наш асноўны кантынгент, бо гэтыя хлопцы і дзяўчаты робяць усвядомлены выбар прафесіі, яны знаёмыя з яе асновамі, бо вывучалі іх два гады на школьным факультатыве. Цікава, што сярод абітурыентаў нямала і прадстаўнікоў педагагічных дынастый. Напрыклад, у БДПУ падаў заяву выпускнік сталічнай школы № 32 Аляксей Баравік, які будзе настаўнікам у пятым пакаленні. Гэта ўнікальны выпадак».

Аляксандр Жук адзначыў рост прахадных балаў, які адбыўся, — на некаторых спецыяльнасцях яны вышэйшыя за 310.

— Па васьмі спецыяльнасцях яшчэ праходзяць унутраныя экзамены — на факультэтах эстэтычнай адукацыі, фізічнага выхавання і філалагічным. Разлічваем, што і там складуцца прахадныя не ніжэйшыя за 300. У апошнія гады да нас прыходзяць абітурыенты іншага ўзроўню — больш матываваныя і падрыхтаваныя.

Сёлета на факультэце фізвыхавання ад агульнай колькасці тых, хто падаў заявы, — 60 працэнтаў юнакоў, на гістарычным — 55 працэнтаў. Траціна студэнтаў на фізіка-матэматычным факультэце — таксама хлопцы. Гэта значыць, што педагагічная прафесія становіцца ўсё больш мужчынскай, і гэта не можа не радаваць, — падкрэслівае рэктар.

Усяго за час уступнай кампаніі на бюджэт у БДПУ было пададзена амаль 2300 заяў ад абітурыентаў: з іх 76 — ад медалістаў, 128 маюць дыплом з адзнакай, 203 — выпускнікі педкласаў.

Набор на дзённую бюджэтную форму навучання складае ў БДПУ 885 чалавек, на дзённую платную — 435, на завочную бюджэтную — 275 і на завочную платную — 600.

ТЫСЯЧА ЗАЯЎ — У АПОШНІ ДЗЕНЬ

У Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце агульная колькасць пададзеных заяў на дзённую бюджэтную форму навучання склала 3081, на завочную форму — 1190. У сярэднім кожны дзень прыёмнай кампаніі ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце падавалася 500 заяў, выключэннем стаў апошні дзень, калі было пададзена адразу 1000 заяў. У БНТУ такі ажыятаж стаў традыцыйным, бо аднолькавы набор сертыфікатаў тут можна падаць на мноства тэхнічных спецыяльнасцяў.

Выпускніца Ліцэя БДУ Анастасія Савасцёнак набрала 400 балаў з 400 магчымых: у «максімум» увайшлі вынікі ЦТ па беларускай і англійскай мовах, сярэдні бал атэстата і 100 балаў за перамогу на рэспубліканскай алімпіядзе па грамадазнаўстве. У гісторыі прыёмных кампаній у нашай краіне гэта другі выпадак максімальных балаў у абітурыента. У першым выпадку абітурыентка таксама выбрала факультэт міжнародных адносін БДУ.

Па папярэдніх выніках найбольш высокі конкурс сфарміраваўся на наступных спецыяльнасцях: «маркетынг» на факультэце маркетынгу, менеджменту, прадпрымальніцтва — 5,5 чалавека на месца; «праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» на факультэце інфармацыйных тэхналогій і робататэхнікі — 4,47 чалавека на месца; «аўтасэрвіс» на аўтатрактарным факультэце — 3,53 чалавека на месца; «эканоміка і арганізацыя вытворчасці (машынабудаванне)» на машынабудаўнічым факультэце — 3,2 чалавека на месца; «транспартная лагістыка (аўтамабільны транспарт)» на аўтатрактарным факультэце — 3,1 чалавека на месца; «менеджмент (па напрамках)» на факультэце тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі — 3 чалавекі на месца.

Лідзіруючыя пазіцыі ў маніторынгу прахадных балаў па традыцыі займаюць спецыяльнасці архітэктурнага факультэта. Па папярэдніх звестках колькасць пададзеных заяў на спецыяльнасцях «архітэктура» і «архітэктурны дызайн» перавышае план прыёму ў чатыры разы.

Па словах адказнага сакратара прыёмнай камісіі Андрэя САФОНАВА, большая частка факультэтаў выканала план прыёму на бюджэтныя месцы.

Трэба дадаць, што на сайтах некаторых ВНУ ўжо можна азнаёміцца са спісамі абітурыентаў, рэкамендаваных да залічэння. Прыём заяў на платную форму навучання ў вышэйшых навучальных установах прадоўжыцца да 9 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота з сайта bsuir.by

МАЛАТКОМ ПА МІНЕ

Куды рушыць Літва?

Нелегальныя мігранты ў Літве зладзілі бунт у адной з былых школ, перароблennай пад лагер для бежанцаў. Пра гэта паведаміла delfi.lt. Нелегалы адмовіліся выконваць патрабаванні супрацоўнікаў Службы грамадскай бяспекі. Адзначаецца, што некаторыя бежанцы з Ірака перасталі прымаць харчаванне ад літоўскіх сацработнікаў, яны не дазволілі браць ежу нават дзецям і падлеткам, а таксама жанчынам. «Ад сённяшняй раніцы і гаворкі няма пра перагаворы. Адзінае іх патрабаванне — выпусціць з тэрыторыі. Там усюды смецце, у туалетах экскрэменты льюцца цераз край, мігранты не пускаюць спецыялістаў чыніць каналізацыю. Зараз мы і самі баімся пасылаць туды работнікаў, гэта небяспечна», — прызнаўся delfi.lt намеснік дырэктара адміністрацыі Алітускага муніцыпалітэта Віргіліюс Пранскявічус. Пры гэтым бунты мігрантаў ахапілі многія тэрыторыі Літвы. Раней тое ж delfi.lt паведамляла пра выступленне ў горадзе Ігналіне. «Нашы мігранты адмовіліся ад ежы. Патрабавалі вярнуць ім мабільныя тэлефоны. Нарастае незадаволенасць», — заўважыў мэр Ігналінскага раёна Юстас Расікас. У пачатку ліпеня ўлады Літвы ўвялі рэжым надзвычайнага становішча з-за наплыву бежанцаў. Відавочна, што Вільнюс канчаткова страціў кіраванне сітуацыяй, крызіс хутка паглыбляецца і ўжо набыў пагрозлівыя маштабы. Шмат у чым гэта вынік бязглуздых дзеянняў літоўскай улады. Куды ж рушыць Літва?

ЯК ПРАЙСЦІ НА ПАРЫЖ?

Спачатку бежанцаў размяшчалі ў спецыяльным цэнтры для мігрантаў у горадзе Пабрадзе, пасля абсталявалі для іх палатачныя гарадкі. Калі запоўніліся і яны, замежнікаў пачалі сяліць у інтэрнатах і будынках школ па ўсёй краіне. У сувязі з гэтым узнікаюць шматлікія канфлікты. Мэр Ігналінскага раёна Юстас Расікас расказаў, што прыезджыя абураюцца беднай ежай, патрабуюць размяшчаць жанчын-мусульманак асобна ад мужчын, хочуць мець магчымасць вольна шпацыраваць па горадзе.

З мігрантамі звязана нямала кур'ёзных эпізодаў, адзначае iz.ru. Так, кіраўнік Лаздзійскага раёна Аўсма Мішкіненэ расказала, што прыезджыя не знаёмыя з выгодамі цывілізацыі. «Мыюць ногі ва ўнітазах, кідаюць туды смецце. Нашы сантэхнікі кожны дзень прачышчаюць забітыя трубы», — абураецца жанчына. Кіраўнік Капчамесцкага лесагадавальніка Рымантас Пілецкас распавёў, што яго супрацоўніцы зранку сустрэлі ў лесе групу чарнаскурых незнаёмцаў. «Мужчыны кінуліся ў гушчар, а жанчыны, прыкрываючы твары хусткамі, пыталіся дарогу на Парыж», — паведаміў ён.

З апошніх навін. Групы жыхароў Літвы на аўтамабілях блакіруюць подступы да палігона ў ваколіцах мястэчка Руднінкай (Салечніцкі раён), дзе мяркуецца размясціць нелегальных мігрантаў. Як сказаў агенцтву BNS кіраўнік літоўскай Службы грамадскай бяспекі Рычардас Поцюс, быў заблакіраваны мост праз раку Меркіс. «Не прапускаюць грузавікі з палаткамі і іншым абсталяваннем», — растлумачыў Поцюс.

Напярэдадні міністр унутраных спраў Агнэ Білатайтэ паведаміла, што каля 1,5 тысячы іншаземцаў будзе размешчана на палігоне ў Руднінкаі ў палатачным гарадку. «Прынята рашэнне, зараз палаткі вязуць на Руднінкайскі палігон, які з'яўляецца тэрыторыяй, паднаглядн Службе грамадскай бяспекі. Там дакладна будзе нескладана забяспечыць пытанні бяспекі», — сказала яна журналістам.

Калі інфармацыю распаўсюдзілі СМІ, адразу паўстала супрацьстаянне сілавікоў з месцічамі. «Мабыць, адбываецца тое ж, што ў Дзевянішкяс», — паясніў Рычардас Поцюс. Кіраўнік літоўскай Службы грамадскай бяспекі нездарма згадаў нядаўні скандальны выпадак. Раней літоўскія ўлады абвясцілі аб намеры разглядзець пытанне будаўніцтва цэнтра для нелегальных мігрантаў у месцы кампактнага пражывання польскай нацменшасці Дзевянішкяс. Пра гэта паведаміў Telegram-канал Baltnews. Паводле задумкі ўрада, туды планавалі звезці бежанцаў з афрыканскіх краін і пасяліць іх у будынку, прылеглым да дзвюх школ Дзевянішкеса. Зразумела, даведаўшыся пра такія планы, палякі зладзілі акцыю пратэсту і паабяцалі не дапусціць з'яўлення нелегалаў на сваёй зямлі.

На думку месцічаў, будаўніцтва цэнтра нанясе непапраўную шкоду быту і гаспадарцы. «Літоўскі ўрад хоча пасяліць больш за тысячу ісламскіх мігрантаў. Для польскай абшчыны з 500 чалавек гэта азначае спусташэнне», — падтрымала суайчыннікаў дэпутат сейма Польшчы Ганна Марыя Яркоўская. Яна падкрэсліла, што падобныя планы супярэчаць двухбаковай дамове Літвы і Польшчы, згодна з якой бакі абавязаліся ўстрымлівацца ад дзеянняў, якія прывялі б да парушэння ўкладу жыцця ў раёнах пражывання нацыянальных меншасцяў. Убачыўшы такі значны рэзананс, у тым ліку і з боку суседняй дзяржавы, літоўскія ўлады ўзялі тайм-аўт. Аднак абяцалі вярнуцца да вырашэння пытання ўжо ў найбліжэйшы час. І амаль адразу ж паўстала супрацьстаянне з месцічамі ў Руднінкаі.

НА ШТУРМ ВІЛЬНЮСА

Тым часам, крызіс набыў сістэмны характар. Паралельна ўзнікла і супрацьстаянне афіцыйнага Вільнюса з мясцовымі органамі ўлады Літвы. Апошнія пачалі актыўна супраціўляцца рашэнням кіраўніцтва аб размяшчэнні мігрантаў, паведаміла m.nedelia.lt. Напрыклад, улады Шальчынінкскага раёна запрацівіліся планам Міністэрства ўнутраных спраў. Мэр Шальчынінкскага раёна Здзіслаў Палявіч заявіў, што даведаўся пра планы перамяшчэння мігрантаў у Дзевянішкяс са СМІ, а цэнтральныя ўлады яму пра тое не паведамілі. «Пра гэта нічога не ведалі ні мясцовыя ўлады, ні мясцовыя жыхары , якіх гэта датычыцца перш за ўсё», — абурыўся ён.

Чыноўнік падкрэсліў, што гаворка ідзе аб невялікім гарадскім цэнтры, у якім дзейнічаюць дзве гімназіі, дзе вучыцца каля 200 дзяцей. «Для мяне важней за ўсё — бяспека нашых жыхароў», — дадаў Палявіч. Прадстаўнік па сувязях з грамадскасцю міністра ўнутраных спраў Літвы Ліна Лаўрнайтытэ-Гргенэ адмовілася даваць BNS каментарый з нагоды таго, ці ўлічыць МУС заяву раённых улад.

Міграцыйны крызіс можа прывесці да змены ўлады ў Літве. Такое меркаванне ў сваім Telegram-канале апублікаваў беларускі аналітык Аляксей Дзермант. «Міграцыйны крызіс у Літве можа запусціць там працэс змены ўлады. У месцах размяшчэння бежанцаў пачынаюцца стыхійныя мітынгі супраць гэтага, напрыклад, у мястэчка Дзевянішкяс людзі на такі мітынг з'язджаліся з усёй Літвы. 29 ліпеня будзе мітынг у Вільнюсе», — адзначыў эксперт.

Ён упэўнены, што на фоне нездольнасці вырашыць праблему цяперашнім урадам, пасля правалу перагавораў міністра замежных спраў Габрэлюса Ландсбергіса ў Іраку і павелічэння колькасці авіярэйсаў з Багдада ў Мінск, шэраг буйных літоўскіх палітыкаў стаў адкрыта гаварыць, што «сітуацыю можна выправіць толькі пасля дамоўленасцяў з Беларуссю». «ЕС і ЗША далі празрыста зразумець, што праблема з мігрантамі — гэта праблема Літвы. А тым часам на граніцы кожныя суткі працягваюць затрымліваць больш за сотню нелегалаў. У месцах іх утрымання, дзе іх ужо некалькі тысяч, таксама пачынаюцца хваляванні», — заўважыў Аляксей Дзермант. Раней ён заявіў, што «гэтыя людзі ад безвыходнасці, холаду і голаду пойдуць на штурм буйнога горада. Хутчэй за ўсё, Вільнюса».

АПОШНЯЯ КРОПЛЯ

А ў Літве нелегальных мігрантаў прызналі «гібрыднымі агрэсарамі». Пра гэта паведаміў Telegram-канал Baltnews. За адпаведную рэзалюцыю прагаласавалі 56 дэпутатаў з 82. Як вядома, прэзідэнт Літвы Гітанас Наўседа, які ўвесь час заяўляе пра прыярытэт правоў чалавека, зацвердзіў неадназначныя папраўкі да закона «Аб прававым становішчы замежных асоб».

«Па факце мы яшчэ раз пераканаліся ў відавочным: правы канкрэтных людзей, няхай гэта ў Беларусі, Іраку або Сірыі, на справе абсалютна не хвалююць палітычнае кіраўніцтва Літвы. Размовы — гэта адно, а канкрэтныя ўчынкі сведчаць, на жаль, зусім пра іншае, — адзначыў прэс-сакратар МЗС Анатоль Глаз. — Таму мы ўсе сталі сведкамі бесчалавечных, здзеклівых адносін літоўскіх пагранічнікаў да іракцаў, якія вымушаныя шукаць лепшую долю не па сваёй віне, спрабавалі атрымаць прытулак у шчаслівай і прыстойнай, як яны думалі, еўрапейскай краіне». Як адзначылі ў МЗС, пасля такога жаху папраўкі да згаданага закона ўжо проста дапаўняюць відавочную карціну. «І няма сэнсу пералічваць палажэнні міжнароднага права, двухбаковых і шматбаковых пагадненняў, ды і проста маральных крытэрыяў, якія гэты закон не парушае. Такіх палажэнняў проста няма», — падкрэслілі ў прэс-службе ведамства.

«Характэрна, што нават у самой Літве ёсць разважлівыя людзі, якія выдатна разумеюць, што гэта фактычна ўзаконіць парушэнне правоў чалавека ў дачыненні да тых, хто спрабуе выратаваць сябе і сваіх дзяцей ад жахаў і наступстваў развязанай пад прыгожымі дэмакратычнымі лозунгамі вайны. Многія літоўскія юрысты выказалі заўвагі адносна верагоднай супярэчлівасці паправак Канстытуцыі Літоўскай Рэспублікі. Але што мы чуем ад кіраўніцтва Літвы? Так, закон дрэнны, «дзіравы», ён парушае правы чалавека. Але нам, маўляў, трэба паслаць сігнал краінам-донарам бежанцаў. Сапраўды, якія ўжо тут правы, калі трэба паслаць нейкі сігнал!» — звярнулі ўвагу ў МЗС.

Там канстатавалі, што не чуваць рэзкіх заяў заходніх партнёраў у дачыненні да гэтых паправак: «Дзе праверкі і расследаванні? Атрымліваецца, што ў «дэмакратычнай» краіне можна і цяжарных жанчын пад аўтаматы? Можа быць, міжнародныя праваабарончыя арганізацыі, у якіх відавочна ёсць на гэта свабодныя рэсурсы, нават прыдумаюць для Літвы які-небудзь эксклюзіўны механізм маніторынгу і расследавання парушэнняў правоў чалавека — мігранты ж таксама людзі? Ці не?»

У ведамстве падкрэслілі, што спробы Вільнюса схаваць дапушчаную татальную дэградацыю сваёй сістэмы пагранічнай службы «шытыя белымі ніткамі». «Раней гэта было магчыма, таму што многія гады гэтую граніцу абараняла Беларусь, і літоўскаму боку можна было не турбавацца. Затым, вобразна кажучы, літоўскія палітыкі пачалі «стукаць малатком па міне». Сваёй мэты дамагліся. Цяпер робяць выгляд, што здзіўлены», — рэзюмаваў прэс-сакратар МЗС.

Пётр ДУНЬКО.

ДАСЛОЎНА

«ШТО Ж ВЫ, ЯК НАЦЫСТЫ, ІХ ВЫШТУРХОЎВАЕЦЕ?»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на нарадзе па прыярытэтах знешняй палітыкі на сучасным этапе заявіў аб нялюдскім стаўленні да мігрантаў у Літве.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на стаўленне літоўскага боку да мігрантаў, якіх затрымліваюць пры перасячэнні граніцы, і параўнаў умовы ўтрымання бежанцаў з канцэнтрацыйнымі лагерамі. У сувязі з гэтым Прэзідэнт расказаў пра інцыдэнт, які адбыўся на беларуска-літоўскай граніцы. Пра гэта былі паказаны сюжэты на беларускіх тэлеканалах. Гаворка ідзе пра групу з 26 мігрантаў (пераважна жанчын і дзяцей), якіх прымусова, пагражаючы зброяй, адправілі праз граніцу з літоўскай тэрыторыі на беларускую.

«Адабралі ў іх дакументы, парвалі ў іх на вачах пашпарты і растапталі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Узброеныя. Вывелі іх на беларуска-літоўскую граніцу, паставілі напарадзе, як фашысты (памятаеце, у наступленне бралі мірных жыхароў і пасылалі напарадзе сябе). Вось дакладна так яны пастроілі гэтых 26 чалавек і пагналі праз граніцу, адкрыўшы стральбу па-над галовамі. Збілі, цяпер некаторыя ў бальніцы знаходзяцца».

Сярод пацярпелых была нават цяжарная жанчына. «Яна што, гэтая жанчына і яе дзеткі, пагрозу ўяўлялі Літве і Еўрасаюзу? Не, яна бегла ад вайны, якую яны развязалі на Блізкім Усходзе, пачынаючы ад Алжыра і сёння заканчваючы Сірыяй», — эмацыянальна адрэагаваў Прэзідэнт.

Беларускі лідар падкрэсліў, што прычынай росту патокаў мігрантаў у еўрапейскія краіны сталі ваенныя дзеянні ў шэрагу рэгіёнаў. «Яны знішчылі Муамара Кадафі, Садама Хусэйна. Я быў у гэтых краінах. Гэта былі багатыя дзяржавы, якія нармальна развіваліся. Своеасаблівыя, як і ўсе іншыя дзяржавы. Разбілі Блізкі Усход, вайна дагэтуль ідзе ў Лівіі і Сірыі. Знішчылі Ірак — найбагацейшую краіну. У імя чаго? Дэмакратыю прынеслі пад крылом знішчальнікаў? Ніякай дэмакратыі. Распатрашылі Афганістан і вывелі войскі. Што там адбываецца — ведаеце. І людзі бягуць ад вайны, каб ўратаваць дзетак, каб дзесьці атрымаць кавалак хлеба і накарміць іх. Вы ж іх туды паклікалі, што ж вы, як нацысты, цяпер іх выштурхоўваеце адтуль?» — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць, што патокі нелегальных мігрантаў працягнуць прыбываць у Еўропу: «Тое, што людзі туды падаліся, — гэта толькі пачатак». Рэакцыю заходніх краін на існуючую праблему кіраўнік дзяржавы ахарактарызаваў так: «Вось іх твар — гідкі, фашысцкі, нацысцкі твар. Яны заўсёды былі такія, паглядзіце гісторыю. Нават не кожнае стагоддзе, а кожныя паўстагоддзя яны падкідвалі праблемы — то адну вайну, то другую. Няўжо мне вас трэба пераконваць у тым, што беларусы — людзі святыя. Яны ніколі не навязвалі праблем сваім суседзям і нават не суседзям. Мы, калі і ваявалі, то толькі за сваё, калі да нас прыходзілі з мячом», — рэзюмаваў Прэзідэнт.

БЕЛАРУСБАНК

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ

Организатор торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества – Минское областное управление № 500 ОАО «АСБ Беларусбанк»

Наименование объекта продажи	**Изолированное помещение с инвентарным номером 640/D-5353, расположенное по адресу: Минская область, Любанский р-н, аг. Осовец, ул. Советская, 44-2, общей площадью 62,6 кв. м**
Начальная цена продажи	5193,17 бел. руб. (пять тысяч сто девяносто три рубля 17 копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	260,0 бел. руб.
Дата проведения аукциона	08.09.2021
Сроки и место подачи документов на участие	**До 15.30 03.09.2021** по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 69/1, кабинет 108
Продавец	ОАО «АСБ Беларусбанк». Договор купли-продажи заключается ОАО «АСБ Беларусбанк» (г. Минск) и регистрируется в органе по государственной регистрации по месту нахождения объекта
Контактные данные	По вопросам, связанным с объектом продажи, обращаться по телефонам: 8 (017) 2214030, 8 (029) 198-19-17

Для участия в открытом аукционе представляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка на счет № BY 69 AKBB 66708597000020000000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 100325912.

К заявлению также прилагаются:

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования, а также копии учредительных документов юридического лица;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданной обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

гражданином Республики Беларусь – копия паспорта (стр. 25, 31, 33);

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на русский или белорусский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном порядке.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

При подаче заявления организатором открытого аукциона с участниками заключается соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Аукцион по продаже недвижимого имущества будет проводиться с повышением цены. Шаг аукциона – 5 % от первоначальной цены. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Победителем аукциона возмещаются затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 рабочих дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона.

Круглую печать Микашевичского общественного объединения Пинских партизан-ветеранов Великой Отечественной войны 1941–1945 гг. **считать недействительной в связи с утерей.**

Сведения о результатах проведения Рекламной игры

«СОСЕДИ: ЗАРЯДИСЬ НА ЛЕТНИЙ ДВИЖ!»

Сведения об организаторе:

Белорусско-эстонское совместное предприятие «ПРАЙМЭРИ» общество с ограниченной ответственностью с местом нахождения по адресу: 220030, Республика Беларусь, г. Минск, пер. Казарменный, дом 4, помещение 2. УНП 101132766.

Наименование Рекламной игры:

«Соседи: зарядись на летний движ!»

Срок начала и окончания Рекламной игры

Срок начала Рекламной игры – 14 июня 2021 года.

Срок окончания Рекламной игры – 2 августа 2021 года.

Сведения о государственной регистрации Рекламной игры

Рекламная игра зарегистрирована Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 28 мая 2021 года, свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4002.

Сведения о количестве участников Рекламной игры:

В Рекламной игре приняло участие 7 410 человек.

Сведения о розыгрыше призового фонда

Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.

Сведения о победителях и их выигрышах

По одному Еженедельному призу, включающему в себя Умные часы Apple Watch Series 6 GPS 40mm / MG143, стоимостью 1 509,00 белорусских рублей, а также денежные средства в сумме 203,07 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграли следующие участники:

№ п/п	ФИО Победителя
1	Метелица Д. В.
2	Невмержицкий В. А.
3	Андриевич Ю. Е.
4	Кучеренко В. С.

Главный приз, включающий в себя Электросамокат Xiaomi Electric Scooter 1S EU / FBC4019GL (черный), стоимостью 1 599,00 белорусских рублей, а также денежные средства в сумме 216,52 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза, выиграл следующий участник:

№ п/п	ФИО Победителя
1	Воробьёв И. А.

Резервный Победитель, который имеет право на получение Главного приза (Электросамокат Xiaomi Electric Scooter 1S EU / FBC4019GL (черный), стоимостью 1 599,00 белорусских рублей, а также денежные средства в сумме 216,52 белорусских рублей, которые удерживаются Организатором для уплаты за Победителя подоходного налога с общей стоимости приза) в случае, предусмотренном в п. 6.3. Правил (при невыдаче Главного приза основному Победителю):

№ п/п	ФИО Победителя
1	Малкин М. Л.

Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры +375 17 239 06 65.

Телефон Организатора Рекламной игры по вопросам, связанным с выдачей призов (выигрышей) +375 29 513 46 94.

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО **«СТРОЙДЕТАЛИ»**

Месторасположение:
Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская, д. 134

Общим собранием акционеров общества от 27.07.2021 г.

ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ:

1. Утвердить чистую прибыль направленную на начисление дивидендов за первое полугодие 2021 года в сумме 239 076,49 рубля.

1.1. Утвердить начисление дивиденда на 1 акцию с налогами за первое полугодие 2021 года в размере 3,1555 рубля.

1.2. Выплату дивидендов за первое полугодие 2021 года произвести с 28 июля 2021 года по 31 августа 2021 года.

2. Внесение изменений в Устав общества – утвердить.

УНП 600246748

ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз» (продавец) извещает о проведении 12 августа 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

№ лота	Наименование имущества	Код/ Инв. №	Начальная цена продажи с НДС, бел. руб.	Задаток (10 %) с НДС, бел. руб.
1	Флексографическая машина планетарного типа ONYX 865 XS MOD. 100 (4020), дозатор для пластмасс DGM640-SRRS/CRG68 (4064), дозатор для пластмасс DGM640-SSSR/4-R12C42K3/TF46M (4065), печатная машина «Vandamm 560 com» (2661), ПЕЧАТНАЯ МАШИНА /ПОЛИТАЙП/ (2322), печатная машина Saturno 608-3068-S (2622), печатная машина Van Dam 550 (2580)		1 052 460,00	105 246,00
2	Втулка-гильза 76,6*9,5*1285 (Слоним)	0000011621	16,20	1,62

Продавец: ОАО «Борисовский завод полимерной тары «Полимиз», Минская область, г. Борисов, ул. Ибаррури, 42.

Контактный телефон +375 29 655 50 51.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо: 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 10.08.2021 г. в 17.00.**

Для участия в аукционе представляются: документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность; представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти)** календарных дней с момента подписания протокола; оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти)** рабочих дней после подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by

БАНК ДАБРАБЫТ

Открытое акционерное общество «Банк Дабрабыт»
220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом. 1, УНН 807000002

Бухгалтерский баланс на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2021	01.01.2021
1	2	3	4	5
1	АКТИВЫ			
2	Денежные средства	1101	30 468	38 858
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	-	-
4	Средства в Национальном банке	1103	152 322	151 868
5	Средства в банках	1104	84 089	133 962
6	Ценные бумаги	1105	292 181	281 904
7	Кредиты клиентам	1106	750 766	710 100
8	Производные финансовые активы	1107	2 196	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	119	176
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	44 851	45 170
11	Доходные вложения в материальные активы	1110	-	91
12	Имущество, предназначенное для продажи	1111	3 276	3 102
13	Отложенные налоговые активы	1112	-	8
14	Прочие активы	1113	25 285	19 675
15	ИТОГО активы	11	1 385 553	1 384 914
16	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
17	Средства Национального банка	1201	55 709	90 000
18	Средства банков	1202	179 592	136 623
19	Средства клиентов	1203	857 853	910 185
20	Ценные бумаги банка	1204	102 700	65 200
21	Производные финансовые обязательства	1205	9	2 269
22	Отложенные налоговые обязательства	1206	-	-
23	Прочие обязательства	1207	10 483	11 828
24	ВСЕГО обязательства	120	1 206 346	1 216 105
25	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
26	Уставный фонд	1211	47 682	47 682
27	Эмиссионный доход	1212	-	-
28	Резервный фонд	1213	15 914	13 723
29	Фонд переоценки статей баланса	1214	27 201	27 704
30	Накопленная прибыль	1215	88 410	79 700
31	ВСЕГО собственный капитал	121	179 207	168 809
32	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	1 385 553	1 384 914

Отчет о прибылях и убытках на 1 июля 2021 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	01.07.2021	01.07.2020
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	55 560	47 287
2	Процентные расходы	2012	33 267	29 166
3	Чистые процентные доходы	201	22 293	18 121
4	Комиссионные доходы	2021	24 891	17 007
5	Комиссионные расходы	2022	5 226	5 710
6	Чистые комиссионные доходы	202	19 665	11 297
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	(3 187)	2 110
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	6 295	6 311
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	2 978	2 996
11	Чистые отчисления в резервы	207	2 579	4 367
12	Прочие доходы	208	4 424	2 239
13	Операционные расходы	209	27 562	22 794
14	Прочие расходы	210	1 396	1 815
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	20 931	14 098
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	4 874	1 877
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	16 057	12 221

Председатель Правления И.В. Лихогруд

Главный бухгалтер А.В. Дорожкин

Квартальная индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка: **https://bankdabrabyt.by/about/finance/**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 16, выдана Национальным банком Республики Беларусь 28 января 2019 года. УНП 807000002

На кантролі

КАМУ НЕ ДАПАМАГЛО АБ'ЯДНАННЕ?

Не ўсе сельскія гаспадаркі, якія далучылі да буйных прадпрыемстваў, выйшлі ў плюс

Там, дзе значныя сродкі былі накіраваныя на мадэрнізацыю і аднаўленне асноўных фондаў, справы палепшыліся. А калі грашовыя патокі ў асноўным ідуць на падтрыманне бягучай дзейнасці, дасягнуць высокіх вынікаў не ўдаецца. Такі вывад зрабілі спецыялісты Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці пасля аналізу работы сельгаспрадпрыемстваў — філіялаў.

У Гродзенскай вобласці рэарганізацыя нізкаэфектыўных сельскагаспадарчых арганізацый пачалася яшчэ ў 2004 годзе. За гэты час новых інвестараў займелі 25 прадпрыемстваў АПК. З іх чатыры былі прададзеныя і 21 перададзена фірмам-прамыславікам. Як правіла, інвестары — буйныя арганізацыі з рознымі формамі ўласнасці, якія працуюць у розных галінах эканомікі (будаўнічай, перапрацоўчай, нафтахімічнай і іншых).

У Камітэце дзяржкантролю зрабілі аналіз дзейнасці філіялаў, які паказаў, што ва ўсіх выпадках дасягнуты рост вытворчасці. Але не ўсё так добра з эканамічнымі паказчыкамі. Некаторыя сельгасарганізацыі маюць адмоўную рэнтабельнасць, нягледзячы на значныя сродкі, укладзеныя ў іх інвестарамі. Аказалася, не ўсе распараджаюцца грашыма мэтазгодна.

Тыя, хто мадэрнізавалі прадпрыемства, атрымалі добрыя вынікі. Бо абнаўленне прывяло да зніжэння працаёмкасці, працазатрат на адзінку прадукцыі, што, у сваю чаргу, павысіла эканамічную эфектыўнасць. Адпаведна, вырас і ўзровень заработнай платы. А кадры, як вядома, далёка не апошні фактар эфектыўнай работы аграпрамысловага комплексу.

У ліку аб'ектаў, якія з'явіліся ў гаспадарках, — камбікормавыя цэхі, лініі па перапрацоўцы алейных культур, бульбасховішчы. Таксама сродкі ішлі на рэканструкцыю фермаў, аднаўленне тэхнічнага парку.

Там, дзе грошы, уласна кажучы, праядалі, пускалі на бягучую дзейнасць, добрых вынікаў так і не дасягнулі. Прадпрыемствы працуюць з адмоўнай рэнтабельнасцю, не могуць забяспечыць годны ўзровень аплаты працы, ёсць праблемы з кадрамі.

Спецыялісты КДК прыводзяць прыклады паспяховага альянсу ў рабоце з інвестарамі, і такіх нямала. Так, у Бераставіцкім раёне ў 2005 годзе СВК «Стары Дворац» быў перададзены РУП «Гродназнерга» як філіял. За гэты час дзейнасць аграфірмы набыла ўстойлівую тэндэнцыю росту. Ураджайнасць збожжавых за тры гады выраслa амаль у два разы і летась склала пад 60 ц/га. У 2,5 раза выраслa ўраджайнасць насення рапсу і цукровых буракоў.

Летась атрыманы прыбытак у суме 1,5 мільёна рублёў супраць 124 тысяч у 2018 годзе. Назіраецца і рост зарплаты. Запазычанасць філіяла за год скарацілася больш чым на два мільёны рублёў.

Значная дапамога аказана Гродзенскай тытунёвай фабрыкай свайму філіялу — СУП «Ханчыцы — Нёман» Свіслацкага раёна. За два гады сюды накіравана 26 мільёнаў рублёў, з іх 16 мільёнаў — на набыццё асноўных фондаў. Вынікаў не прыйшлося доўга чакаць. Літаральна за два гады ўраджайнасць збожжавых падскочыла на 150 %. Надой на карову перавышае тысячу кілаграмаў у год. За 2020 год атрыманы прыбытак у суме 740 тысяч рублёў. Зарплата выраслa на 45 % і склала 1200 рублёў.

Адразу некалькі слабых сельгаспрадпрыемстваў далучана да УП «Гроднааблгаз». Цяпер гаспадаркі маюць стабільныя паказчыкі.

Разам з тым, у КДК звяртаюць увагу на малаэфектыўныя філіялы. Многія з іх працуюць са стратамі, хоць атрымліваюць значную фінансавую падтрымку. Напрыклад, філіял «Паўлава-Агра» атрымаў ад свайго галаўнога прадпрыемства — Слонімскага мясакамбіната — 19 мільёнаў рублёў, але з іх толькі чатыры мільёны былі накіраваныя на асноўныя сродкі. І хоць прадпрыемства мае станоўчую дынаміку ў вытворчасці жывёлагадоўчай прадукцыі і раслінаводстве, эканамічнага эфекту ў цэлым па гаспадарцы няма. Праблемы — у рэалізацыі прадукцыі. За апошнія тры гады страты склалі больш за 2,5 мільёна рублёў.

За кошт інвестара-ўласніка ТАА «Біяком» у СВК «Міжэрычы» Зэльвенскага раёна ў жніўні мінулага года ўведзена новая ферма. Але ўстойлівага росту прадукцыі жывёлагадоўлі дасягнуць пакуль не ўдалося.

У КДК удакладняюць, што не ўсе інвестары добрасумленныя. Напрыклад, у мінулым годзе ў Слонімскім раёне з інвестарамі са Славеніі былі заключаны дагаворы на куплю дзвюх сельгасарганізацый. Але акты прыёмкі падпісаныя толькі ў сёлетнім красавіку. Магчыма, на актыўнасць інвестараў паўплывала эпідэмічная сітуацыя. Між тым, на працягу года інвестыцыі ў сельгаспрадпрыемствы не паступалі, а іх паказчыкі зніжаліся.

Для паляпшэння эфектыўнасці работы сельгаспрадпрыемстваў спецыялісты КДК прапануюць правядзіць семінары з удзелам інвестараў. Магчыма, апошнім важна наладзіць больш цеснае ўзаемадзеянне са сваімі філіяламі і сачыць за тым, як асвойваюцца выдзеленыя сродкі.

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ОРС Гомель» (арендодатель) извещает о проведении 30 августа 2021 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование и адрес лота	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС 20 %	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС 20 %
1	**Часть капитального строения площадью 194,0 кв. м**, в капитальном строении с инв. № 350/С-34521 на 1-м этаже, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин**. **Местонахождение:** г. Гомель, ул. Шевченко, 9а. Арендная плата в месяц – **174,199 базовой арендной величины** (с учетом НДС 20 %). Коэффициент спроса – **3,0**. Базовая ставка – **0,3**. Коэффициент местоположения – **0,9**. **Цель использования:** розничная торговля. **Срок аренды – 3 (три) года**	**819,65**	81,97
2	**Помещение площадью 146,10 кв. м**, в капитальном строении с инв. № 350/С-30235, помещение на 1-м этаже, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **модульное здание магазина. Местонахождение:** г. Речица, станция Речица. Арендная плата в месяц – **1 857,52 бел. руб.** (с учетом НДС 20 %). **Цель использования:** розничная торговля. **Срок аренды – 3 (три) года**	**617,27**	61,73
Сведения о продавце	ОАО «ОРС Гомель», г. Гомель, ул. Калинина, 14. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 173-57-21 – Лызова Виктория Евгеньевна**		
Срок подачи заявления	**С 29.07.2021 г. по 26.08.2021 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» **(предварительно по контактным телефонам Организатора торгов)**		
Номер р/с для перечисления задатка	Расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1, по лоту № 2 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)		
Размер штрафа	**Лот № 1 – 9 (девять) базовых величин; лот № 2 – 6 (шесть) базовых величин** согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству)		

Шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и представить необходимые документы: копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представитель юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона): в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола оплатить Организатору аукциона по результатам аукциона вознаграждение в размере **10 (десяти) % от цены продажи объекта** (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка РБ на дату подписания протокола о результатах аукциона), а также затраты на публикацию извещения в газете «Звязда» от 29.07.2021 г. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона), в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www. expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 8 (029) 651-22-19, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

УНП 300000398

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
открытого акционерного общества
«Дорожно-строительного треста № 1, г.Витебск»

10 августа 2021 года в 14.30
состоится внеочередное общее собрание акционеров
открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г.Витебск»
Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.

Повестка дня собрания:

1. О принятии решения об объявлении и выплате дивидендов за первое полугодие 2021 года.
2. О внесении изменений в Устав Общества путем изложения Устава в новой редакции.

С информацией (документами), подготовленной к общему собранию акционеров, можно ознакомиться у председателя Наблюдательного совета по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, с 03 августа 2021 г. по 09 августа 2021 г. (время работы с 8.30 до 17.30) либо 10 августа 2021 г. по месту проведения собрания, контактные телефоны: (8-0212) 67-09-04, 66-98-50.

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг и список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, – 02 августа 2021 года.

Регистрация участников собрания с 13.45 до 14.15 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет (протокол № 379 от 28.07.2021).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА (ПОНИЖЕНИЕ ЦЕНЫ НА 10 %)* ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
ОАО «УПРАВЛЯЮЩАЯ КОМПАНИЯ ХОЛДИНГА «ГРОДНООБЛСЕЛЬХОЗТЕХНИКА»

Предмет торгов	Начальная цена с учетом НДС, руб.	Сумма задатка (1 %), руб.
Лот № 1 – свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2, 2008 г. в., зав. № 2310060, рег. № СК-4 2832	95 585,22	956,00
Лот № 2 – свеклоуборочный комбайн HOLMER Terra Dos T2, 2005 г. в., зав. № 192805, рег. № б/н	206 079,07	2 061,00
Лот № 3 – свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2, 2006 г. в., зав. №2210049, рег. № СК-4 2824	60 827,46	608,00
Лот № 4 – свеклоуборочный комбайн Kleine SF-10-2, 2007 г. в., зав. № 2310082, рег. № СК-4 2810	56 268,00	563,00
Местонахождение имущества: Гродненская обл., Щучинский р-н, аг. Рожанка (ОАО «Щучинский ремонтный завод»)		
Сведения о продавце: ОАО «Управляющая компания холдинга «ГродноОблсельхозтехника», г. Гродно, ул. Лермонтова, 2, тел. 8 (0152) 626024		
Сведения об организаторе торгов и номер счета для перечисления задатка: Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел. 8 (0152) 621632, счет BY65BLBB30150500481906001002 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской обл., код BLBBBY2X , УНП 500481906		
Торги состоятся 10 августа 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8		
Срок подачи документов для участия в торгах	**По 4 августа 2021 года включительно до 16.00 по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8**	

Аукцион без условий. Шаг аукциона: 5 %. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 10 рабочих дней с момента проведения аукциона.

Условия оплаты: 100 % предоплата. Условия участия и порядок проведения аукциона по тел. 8 (0152) 621632 и на сайте www.fincentr.by.

Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 17.00, ответственное лицо: Болдовский Алексей Геннадьевич, тел. в г. Гродно: 8 (0152) 626020, 626024.

Предыдущие публикации: газета «Звязда» от 16.06.2021 г., 17.07.2021 г.

** – Понижение цены на 10 %, но не ниже остаточной стоимости с учетом НДС.*

Алімпійскі дзённік

ЭКЗАМЕН АД УДАЧЫ

Алімпійскія гульні — гэта не толькі каласальнае нервовае напружанне для спартсменаў і іх трэнераў, але і хваляванне аматараў. У тых, хто падтрымлівае беларускіх спартсменаў, яно хутка пачне зашкальваць. На шосты дзень Гульняў у беларусаў няма ніводнага медаля. Магчыма, для іх Фартуна падрыхтавала свае выпрабаванні.

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА. Дар'я Барысевіч, якая павінна была выступаць у забегу на 1500 метраў, не выступіць у Токіа. Спартсменка паведаміла пра гэта ўжо ў Алімпійскай вёсцы. «На апошнім зборы атрымала непрыемную траўму Ахілава сухажылля. Ніколі раней не было такіх сур'ёзных пашкоджанняў. Разлічвалі, што паспею аднавіцца, знізілі нагрузку на занятках, але бегчы нельга. Мяне чакае двухмесячнае аднаўленне. Крыўдна, але гэты шлях трэба прайсці», — прыводзіць словы Дар'і прэс-служба Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

ТЭНІС. Беларускія тэнісісты развіваюцца з Токіа. Арына Сабаленка і Ягор Герасімаў спыніліся ў другім крузе адзіночнага разраду. Ілья Івашка дайшоў да трэцяга круга, але там яго спыніў японец Кія Нісікоры. «У нейкі момант у мяне проста ператалі рухацца ногі. Да гэтага два матчы былі зацяжныя, што адыграла сваю ролю. Ну і сапернік загуляў лепш, чым да гэтага», — сказаў Ілья ў каментарыі БелТА.

У парным разрадзе Ілья Івашка і Ягор Герасімаў скончылі сваё выступленне ў першым раўндзе. У турніры змешаных пар Арына Сабаленка і Ілья Івашка не выступяць, беларусам не хапіла балаў у рэйтынгу.

СТРАЛЬБА З ЛУКА. Ганна Марусава паспяхова стартавала ў індывідуальным алімпійскім турніры. У 1/32 фіналу беларуска перамагла вядомую нямецкую лучніцу Лізу Унрух — 6:4, а ў 1/16 фіналу была мацнейшая за японку Азусы Ямаучы — 6:0. 29 ліпеня выступленні ў парным разрадзе пачнуць Карына Казлоўская і Карына Дзёмінская.

АКАДЭМІЧНАЕ ВЕСЛАВАННЕ. Дзмітрый Фурман і Сяргей Валадзько не прабіліся ў медальны заезд мужчынскіх двоек парных. Спартсмены занялі ў сваім паўфінальным заездзе 5-е месца з вынікам 6 хв. 30,66 сек. Яны працягнуць спаборнічаць у фінале В, дзе будуць разыграны месцы з 7-га да 12-га.

ПЛАН НА 29 ЛІПЕНЯ. У чацвер працягнуць выступленне плыўцы, стралкі, баксёры, прадстаўнікі паруснага спорту.

Пачнуцца выступленні па дзюдо. Першы сярод беларусаў на татамі выйдзе Мікіта Свірыд — прыклад таго, што на дзецях вялікіх людзей прырода не заўсёды адпачывае. Яго бацька — галоўны трэнер нацыянальнай зборнай, у мінулым — удзельнік дзвюх Алімпіяд, трохразовы чэмпіён Еўропы і шматразовы прызёр чэмпіянатаў свету па самба. Да Алімпійскіх гульняў у Токіа Мікіта ішоў, як і кожны спартсмен, усё жыццё, але самыя напружаныя выдаліся апошнія тры гады. Як расказваў сам Мікіта на сваёй старонцы ў «Інстаграм», адбор на Алімпіяду пачаўся ў ліпені 2018 года. Для пападання на Гульні трэба было ўваходзіць у топ-18 сусветнага рэйтынгу. Пераход у дарослы спорт, шматлікія траўмы толькі ўскладнялі гэты і так нялёгкі шлях. Але ён змог. Няхай і ў Токіа зможа.

І ўсе беларусы змогуць.

«МЫ ЗАБЯСПЕЧЫМ ВЫРАШЭННЕ ЛЮБОЙ ПРАБЛЕМЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Гэтыя Гульні беспрэцэдэнтныя па сваіх супрацьэпідэмічных мерах і па інфекцыйным кантролі. Алімпіяда буде незвычайная і асабліва няпростая для медыцынскіх работнікаў з улікам таго, што скарочана колькасць медыцынскага штаба. Калі на мінулыя Алімпійскія гульні лятала 27 спецыялістаў, на гэтыя — толькі 10, прычым неапасрэдна дактароў з іх толькі шэсць. Працаваць нам прыйдзецца 24 гадзіны сем дзён у суткі», — адзначыла Ірына Малёваная.

Кожнае месца ў алімпійскай сталовай аддзелена пластыкавымі экранамі. Перш чым узяць сталовыя прыборы, патрэбна надзець пальчаткі.

ЖЫЦЦЁ Ў МАБІЛЬНЫХ ДАДАТКАХ

Самая важная задача для медыкаў, усіх членаў місіі і саміх спартсменаў — уважліва выконваць усе супрацьвірусныя меры. Бадай што, на гэтых Алімпійскіх гульнях перамога над хваробай будзе важнейшая за спартыўныя перамогі. Каб вірус не адолеў удзельнікаў Алімпіяды, арганізатары распрацавалі шэраг мер. «Японцы распрацавалі пяць мабільных дадаткаў, якія павінен усталяваць на свой мабільны тэлефон кожны член дэлегацыі. У кожнага спартсмена павінны быць два дадаткі толькі для перасячэння граніцы. У іх загружаюцца вынікі ПЛР-тэсціравання, там жа запаўняецца анкета. Пасля дадатак генерыруе тры QR-коды, якія неабходныя для пропуску ў аэрапорце. І толькі потым, ужо ў Японіі, робіцца кантрольны тэст ПЛР на антыген. Кожны дзень у 9 гадзін раніцы і 18 гадзін вечара будуць выдавацца прабіркі для тэсціравання на каранавірус», — расказала Ірына Анатольеўна.

Сацыяльная дыстанцыя ў два метры, забарона наведваць вялікія групы людзей, асобнае харчаванне — правілы, якія ўжо здаюцца зразумелымі і не ўспрымаюцца як нешта незвычайнае. Кожнае месца ў алімпійскай сталовай аддзелена пластыкавымі экранамі. Перш чым узяць сталовыя прыборы, патрэбна надзець пальчаткі, а выкарыстаныя прылады пасля скідваюцца ў кантэйнер з антысептыкам. Строгі масачны рэжым таксама наўрад ці можа здзівіць. Сюды ж можна аднесці мноства санітайзераў з антысептыкамі. Па словах Ірыны Малёванай, з Алімпійскай вёскі ў горад нікога не выпусцяць. Спецыяльны транспарт будзе вазіць спартсменаў толькі да спартыўнага аб'екта і назад. Гледачоў на трыбунах не будзе.

Ірына Малёваная падкрэсліла, што ўсім беларускім спартсменам зрабілі прышчэпкі ад каранавіруса. Па яе словах, ніякіх фармакалагічных праблем у іх гэта не выклікае. Як вядома, многія лекавыя сродкі ў спартыўным свеце могуць лічыцца за допінг.

Складанасцяў спартсменам і ўрачам дадаюць розныя часавыя паясы, няпросты японскі клімат і цяжкі трансатлантычны пералёт.

«З вакцынай усё спакойна, там няма ніякага хімічнага рэчыва. Там проста часцінкі або гены, кадзіравальныя бялкі. Гэта не хімічнае рэчыва, яно не будзе доўга цыркуляваць у крыві і выклікаць нейкія рэакцыі. Усе прышчапіліся напярэдадні, каб імунітэт цалкам сфарміраваўся», — растлумачыла галоўны ўрач каманды.

СПРАВІЦЦА З УЛАСНЫМ АРГАНІЗМАМ

Складанасцяў спартсменам і ўрачам дадаюць розныя часавыя паясы, няпросты японскі клімат і цяжкі трансатлантычны пералёт. «Мы старанна аналізавалі, якія могуць быць наступствы пасля трансатлантычнага пералёту са зменай часавога пояса і ў гэтым клімаце. Яшчэ год таму мы падрыхтавалі метадычныя рэкамендацыі. Да пандэміі на розных спартыўных мерапрыемствы ў Токіа высылалі свае пілотныя групы. І яны там абследавалі спартсменаў. Таму нашы рэкамендацыі створаны на практычным вопыце», — кажа Ірына Малёваная.

Праз усё тыя ж каранавірусныя абмежаванні доступ у Алімпійскую вёску для спартсменаў адкрыты за пяць дзён да старту. Для многіх алімпійцаў гэта можа стаць злым жартам, паколькі арганізму патрэбны час на акліматызацыю і адаптацыю. Па словах дырэктара РНПЦ спорту, крытычны перыяд для нармальнай адаптацыі — ад трох да пяці сутак. І пажадана паспець выступіць або ў гэтыя дні ці ўжо пасля пятых сутак. Гэта так званыя кліматычныя ямы, у якія можна трапіць. Козырам для некаторых беларускіх спартсменаў, напрыклад для баксёраў, можа стаць вучэбна-трэніровачны збор ва Уладзівастоку. Клімат, часавы пояс гэтага расійскага горада супадае з умовамі Токіа. І пералёт адтуль да японскай сталіцы значна лягчэйшы.

❍ У ТЭМУ

Інтэрв'ю «Звяздзе» Ірына Малёваная давала да ад'езду ў Токіа. Яна адна з першых членаў беларускай дэлегацыі, хто прыляцеў у японскую сталіцу. Галоўны ўрач беларускай дэлегацыі расказала прэс-службе Міністэрства спорту і турызму, што яна ўбачыла ў алімпійскай сталіцы і як супрацьэпідэмічныя меры прымяняюцца на практыцы.

«Адзін мабільны дадатак адсочвае нашу геапазіцыю, другі штодня трэба запаўняць — там павінны быць даныя пра адчуванне, сімптомы, і гэтыя даныя неабходна адпраўляць у цэнтр. Па геапазіцыі нерэальна кудысьці адысці, таму што вельмі жорсткі кантроль. У Вёсцы кожны дзень спартсмены здаюць аналіз на вызначэнне антыгену на COVID. На жаль, некаторыя каманды з розных краін ужо атрымалі некалькі станоўчых тэстаў. Ёсць выпадкі і шпіталізацыі, і ізаляцыі спартсменаў», — расказала яна.

Таксама антыковідныя меры вельмі выразныя і ў плане цішыні. Электракары амаль бясшумныя. Тут забаронена гучна крычаць, гучна радавацца і выказваць свае эмоцыі, дазволена толькі пляскаць. Японцы вельмі добразычлівыя і гасцінныя, але вельмі патрабавальныя ў выкананні сваіх рэкамендацый», — цытуе Ірыну Малёваную прэс-служба Міністэрства спорту.

Таксама ў каментарыі прэс-службе ведамства дырэктар РНПЦ адзначыла добрую якасць вады і наяўнасць пакеціка з сухім рэчывам, якое ўтрымлівае соль і невялікую колькасць вугляводаў, каб аднавіць водна-электралітны баланс пры вялікіх фізічных нагрузках.

АДКАЗНАСЦЬ ВЫШЭЙШАЯ ЗА ЎСЁ

Да ўсіх складанасцяў і выпрабаванняў урачы беларускай алімпійскай каманды падышлі ў поўным узбраенні. «Фармакалагічны груз у нас склаў 27 вялізных кантэйнераў па 40 кілаграмаў. Будзе своеасаблівы палявы шпіталь, свая экспрэс-лабараторыя, сваё фізіятэрапеўтычнае аддзяленне. Бяром псіхалагічнае абсталяванне, яно ў нас выдатнае, інавацыйнае. Спартсмены будуць адчуваць сябе камфортна, будуць мець усё пад рукой, мы забяспечым вырашэнне любой праблемы», — упэўнена Ірына Малёваная.

У Токіа спаборніцтвы разгорнуцца не толькі на алімпійскіх спартыўных аб'ектах. Складаны пералёт, няпросты клімат з павышанай вільготнасцю і высокай тэмпературай, шасцігадзінная розніца ў часе, эпідэмічныя меры — усё, з чым прыйдзецца змагацца паза межамі арэн. І, як падкрэслівае галоўны ўрач дэлегацыі, самым складаным сапернікам будзе псіхалагічная напружанасць, выкліканая ўсімі вышэйзгаданымі фактарамі. Самым галоўным на гэтых Алімпійскіх гульнях яна называе вельмі сур'ёзны ўзровень адказнасці.

«Не надзеў маску — можа быць дыскваліфікацыя. Парушыў дыстанцыю або не здаў своечасова аналіз — таксама. Усё гэта нам трэба будзе прадугледзець, трымаць руку на пульсе і дзейнічаць па сітуацыі. Наша задача — зрабіць усё магчымае, каб ні адзін спартсмен не трапіў у непрыемную сітуацыю, якая можа перашкодзіць яму выступіць. Мы настроеныя на барацьбу», — упэўненая Ірына Малёваная.

Валерыя СЦЯЦКО.

«Не трэба думаць, што сапраўдную літаратуру ствараюць нейкія бесцялесныя, ідэальныя істоты»

У любы час знаходзяцца людзі, якія прысвячаюць сябе вывучэнню літаратуры — занятку часта няўдзячнаму, часам небяспечнаму... Яўген Гарадніцкі, доктар філалагічных навук, дацэнт, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі, беларускай літаратуры служыць, бадай, усё жыццё... Ён аўтар шматлікіх навуковых прац, артыкулаў і рэцэнзій, якія папулярызуюць айчыннае прыгожае пісьменства. Мастацкасць лічыць найважнейшай якасцю літаратуры, адгукаецца на навінкі, вывучае рамантыку і займаецца праблемай аўтара... А яшчэ выступае як паэт і пісьменнік.

Сёння Яўгену Андрэевічу спаўняецца 70 гадоў, напярэдадні юбілею самы час паразважаць пра справу жыцця, паўспамінаць...

— Якім чынам вы выбралі шлях літаратуразнаўца?

— У мястэчку Ракаве, дзе прайшлі мае дзіцячыя гады, кнігі былі адносна даступнай рэччу. І ўсё ж я мог ледзь не гадзінамі прастойваць пад замкнёнымі дзвярыма бібліятэкі, што размяшчалася ў мястачковым Доме культуры, цярпліва чакаючы, ці не з'явіцца на дарозе здалёк прыкметная, ссутуленая, марудная ў хадзе постаць бібліятэкара. На тое былі свае прычыны. Стары бібліятэкар, былы вязень Асвенцыма, не заўсёды мог саўладаць з горыччу ўспамінаў, і ў такія дні бібліятэка апыналася на замку.

І ўсё ж, як ні дзіўна, паступаў я пасля заканчэння Ракаўскай сярэдняй школы не на філфак, а на хімфак БДУ. У старэйшых класах я даволі сур'ёзна захапіўся хіміяй. Самая пабуджальная прычына рашэння стаць хімікам, ці дакладней біяхімікам, заключалася ў ідэі-фікс, што апанавала мяне тады. Ні больш, ні менш, як вырашыў ашчаслівіць чалавецтва, вынайшаўшы эліксір бессмяротнасці. Прыдумаў нават асобную «ферментатыўную тэорыю». Кандрат Крапіва яшчэ не браўся ў той час за ахыццяўленне задумы «Брамы неўміручасці». Не ўтойваю, была і яшчэ адна прычына. На хімфак паступала аднакласніца, якая прываблівала не менш, чым хімія. З маёй авантуры (на шчасце?) нічога не атрымалася. Зрэзаўся на пісьмовым па матэматыцы. Таму і «ферментатыўная тэорыя», як, дарэчы, і праект «вечнага рухавіка» (клянуся, накід яго чарцяжа ў мяне быў, ды толькі не захаваўся!), засталіся ў юначых марах.

З гадамі давялося ўпэўніцца ў тым, што бессмяротнасць усё ж такі існуе. Яна ў чалавечым вольным духу, што выяўляецца, мабыць, найперш праз мастацтва.

«Аўтар, які жыве ў XXI стагоддзі, — дзіця свайго веку. У яго шырэйшыя далягляды, універсальныя веды, якія сталі больш даступныя. Што да таленту, дык гэта па-ранейшаму «ў Божай руцэ».

Пасля быў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, на якім вучыўся на вячэрнім аддзяленні. Назаву імёны некалькіх выкладчыкаў, што зрабілі вялікі ўплыў на мае ўяўленні пра філалогію. Ірына Вікенцеўна Шаблоўская, якая ўвяла ў свет мадэрнізму сусветнай літаратуры. Барыс Юсцінавіч Норман, які адкрыў эўрыстычныя магчымасці тэорыі мовы.

— Ваша малая радзіма, наколькі я ведаю, Ракаў... Літаратуразнаўцы любяць шукаць праз творчасць пісьменніка моманты імпрытынгу, звязаныя з дзяцінствам...

— Згадваючы пра Ракаў, не магу не назваць яшчэ аднаго філфакаўскага выкладчыка, вядомага літаратуразнаўца, прафесара Вячаслава Пятровіча Рагойшу. У родным мястэчку ён доўгі час праводзіў «Ракаўскія чытанні», выдаваў газету «Ракаўскі шлях», арганізаваў у бацькоўскай хаце музей. З Ракавам наогул звязана мноства імёнаў выдатных культурных дзеячаў, пачынаючы ад братоў Здзяхоўскіх і Элізы Ажэшкі. Вядома, у дзяцінстве гэта непасрэдна не ўсведамлялася, але ўспрымалася на ўзроўні падсвядомасці. Культурнымі флюідамі было, як той казаў, напоўнена само паветра. І ў наваколлі, у прыродным ландшафце (праз свечаныя сонцам сасоннікі, празрыстая, як сляза, Іслач) было штосьці суладнае элегічна-роздумнаму настрою.

«З гадамі давялося ўпэўніцца ў тым, што бессмяротнасць усё ж такі існуе. Яна ў чалавечым вольным духу, што выяўляецца, мабыць, найперш праз мастацтва».

Мільгаюць у памяці, узнікаюць хіба на момант асобныя малюнкі, абразкі раней перажытага. Некалькі эпізодаў звязана са здымкамі ў Ракаве кіно. Назіраць такія сцэны (камеры, юпітары, здымачны тлум, мнагалюднасць) было для падлетка нязвыкла і да болю завабліва. А вось паўстае зусім іншая выява: старая з цэлым вывадкам коз (яе так і звалі — «Казіная Манька»), у адной руцэ — кій, у другой — малітоўнік. Першая, па сутнасці, пропаведзь — пра Хрыста, яго дзеі, якую пачуў падлетак тут, сярод ракаўскіх разлогаў.

— Адна з вашых навуковых прац прысвечана праблеме аўтара ў беларускай літаратуры... Ці змяніўся сучасны беларускі аўтар як асоба?

— Дарэчы, першага аўтара, «жывога паэта» ўбачыў я калісьці на сцэне ракаўскага Дома культуры. Гэта быў Алесь Ставер. І верш, які ён чытаў, помню. Гэта яго славуты «Бубен» («Бубен б'іў у добрым гудзе...»). З гэтым вершам і іншымі паэт аб'ехаў, напэўна, усю Беларусь. Ну, так. Тады несла, як той казаў, «культуру ў масы» так званае бюро прапаганды Саюза пісьменнікаў. Умовы, у тым ліку і бытавыя, у якіх жыў у той час беларускі літаратар, былі непараўнальныя з цяперашнімі.

Ці змяніўся аўтар унутрана? Вядома, змяніўся. Аўтар, які жыве ў XXI стагоддзі, — дзіця свайго веку. У яго шырэйшыя далягляды, універсальныя веды, якія сталі больш даступныя. Што да таленту, дык гэта па-ранейшаму «ў Божай руцэ».

— Вы заўсёды можаце адрозніць у тэксце, які даследуеце, аўтарскі вымысел ад рэальнага апісання, ці было, што і памыляліся?

— Адна з самых распаўсюджаных памылак чытача — прыпісванне аўтару характарыстык яго герояў. У «Чорным замку Альшанскім» Караткевіча дамінанта стылёвага выражэння належыць апавядальніку і герою Антону Космічу, а не аўтару. Пра гэта забываюцца, калі дакараюць менавіта аўтара ў стылёвай легкаважнасці. І яшчэ адзін — зусім ужо кур'ёзны выпадак. Ранні празаічны твор Якуба Коласа «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле». Будучаму класіку спатрэбіўся расказчык, які б звязаў сабой размыты апавядальны матэрыял. Таму ён прадстаўляе твор як нібыта напісаны вясковым грамацеем, старым Карусём Лапцем. Адсюль і адпаведны стыль аповеду. Памылкова пачалі лічыць Каруся Лапця псеўданімам пісьменніка. І, адпаведна, нярэдкія сталі закіды адносна мастацкай недасканаласці гэтага коласавага твора.

— Як вы пасябравалі з Уладзімірам Караткевічам? І ці лёгка было знаходзіцца з ім у добрых зносінах?

— Наконт сяброўства з Караткевічам — гэта відавочнае перабольшанне. Было некалькі сустрэч, у тым ліку і дома ў пісьменніка, на Карла Маркса, 36. Раскажу пра гэты выпадак. Патэлефанаваў Уладзіміру Сямёнавічу па маёй просьбе мой старэйшы сябра Леанід Самасейка. З тэлефоннай будкі, сярод вулічнага грукату. У той час у мяне памерла маці, быў прыгнечаны настрой, і чамусьці захацелася сустрэцца з пісьменнікам, якога ледзь не абагаўляў. Лявону доўга давялося ўгаворваць Караткевіча, робячы націск на тым, што, маўляў, «гэты хлопец пра цябе пісаў». Урэшце згода была атрымана. Уладзімір Сямёнавіч прыязна нас прыняў, паказаў розныя цікавосткі ў сваім кабінеце. Пад канец размовы дастаў двухтомнік сваіх выбраных твораў з намерам падпісаць яго мне. І тут я асмеліўся папрасіць, каб ён падпісаў мне лепш томік «Каласоў пад сярпом тваім», што выйшаў у выдавецтве «Юнацтва» з маёй прадмовай. Рэакцыя Караткевіча была вельмі экспрэсіўная. Ён выказаўся задужа ўхвальна пра маю прадмоўку і панаракаў пры гэтым на дрэнную чутнасць падчас тэлефоннай размовы з Самасейкам. Дзеля аб'ектыўнасці трэба адзначыць, што не ўсё ў прадмове было адназначна прынята пісьменнікам, які выказаў меркаванне, што на маладога аўтара аказваўся ціск з боку выдавецтва. І гэта было сапраўды так.

Застаўся ў мяне як найкаштоўнейшая рэліквія аўтограф: «Дарагому Яўгену Гарадніцкаму — ад сэрца, з любоўю. Ул. Караткевіч. 15 кастрычніка 81 г.»

— У ацэнках Караткевіча як чалавека ёсць шмат супярэчлівага... Адны выстаўляюць яго высакародным рыцарам, іншыя — апантаным жаночым заляцальнікам, хтосьці — п'яніцам... Вы назвалі яго чалавекам Рэнесансу, прадвеснікам постмадэрну.

— Шырока распаўсюджана меркаванне, што пісьменнік як рэальная асоба не супадае з тым вобразам аўтара, які паўстае з яго твораў. Некаторыя нават асцерагаюцца непасрэдных кантактаў з аўтарам, каб не расчаравацца ў ім як у чалавеку, каб нішто не перашкаджала аб'ектыўнаму ўспрыманню твораў. Думаецца, засцярога гэтая дарэмная. Жорсткай залежнасці паміж аўтарам-чалавекам і створаным ім у мастацтве не існуе. Але няма і непераходнай мяжы. І не трэба думаць, што сапраўдную літаратуру ствараюць нейкія бесцялесныя, ідэальныя істоты анёлападобнага кшталту.

Караткевіч не быў, вядома, анёлам. Па сведчанні многіх, хто ведаў яго, характар у яго быў даволі цяжкі. Паўплывала гэта на яго творчасць? Паўплывала, калі мець на ўвазе не вонкавыя формы выяўлення негатыўных эмоцый, а штосьці больш глыбіннае, што ёсць першапрычынай гэтых эмоцый. Караткевіч пісаў «аголенымі нервамі», іначай і не мелі б мы таго, што маем. Вось гэта і яднае аўтара з яго творамі: той нізкі болевы парог, тыя датклівасць і ўразлівасць, якія немагчыма імітаваць, бо яны прыродныя.

— Вы верыце ў гамбургскі рахунак у літаратуры? Як ставіцеся да сервільнай крытыкі?

— Ведаеце, я прызнаю патрэбу ў гамбургскім рахунку як арыентацыі на пераадоленне дасягнутага ў мастацтве на сённяшні дзень. І разам з тым дапускаю існаванне сервільнай крытыкі. Гэтыя з'явы знаходзяцца ў розных плоскасцях. Зрэшты, адзін момант іх усё ж збліжае — катэгарычнасць. Што такое ўвогуле «рахунак» і ці маем мы права да кагосьці, тым больш да мастака, выстаўляць якія б там ні было патрабаванні? Як да звону ў вушах назаляе і сёння гэтае здаўна тысячакратна паўторанае: «пісьменнік павінен...», «літаратура павінна...» Нічога яны нікому не павінны!

Сервільная крытыка, тая нібыта не прад'яўляе аніякіх патрабаванняў да аўтара. Аўтар — цаца, і ўсё на гэтым! Але не заўважаючы мастацкіх пралікаў пісьменніка, незаслужана перабольшваючы яго сціплыя здабыткі, мы тым самым праяўляем катэгарычнасць у адным — у раўнадушшы да стану сучаснай літаратуры, а ўвогуле і да аўтара, пра якога пішам, да яго як да асобы.

Ужываю займеннік «мы», таму што не заўсёды і сам здольны выбавіцца з гэтага непашанотнага табару «сервільшчыкаў». Дзіўная рэч! Апошнім часам даводзіцца сутыкацца з такой з'явай: некаторыя аўтары (на шчасце, іх няшмат), як якія-небудзь просьбіты ў казённай установе, проста вымольваюць ад цябе рэцэнзію (вядома, станоўчую). Думаеш: навошта ім гэта трэба? Дзеля чаго ідуць на прыніжэнне, магчыма, і самі гэтага не заўважаючы? Якія гамбургскія рахункі збіраюцца такім чынам аплочваць?

— Вы пісалі яшчэ пра адну асобу, якая «абрасла» міфамі, — Анатоля Сыса... Чаму ўзяліся за аналіз яго творчасці?

— Было... Сабраліся раз у нас дома паэты, сярод іх і Толя Сыс, зусім малады яшчэ, але задзёрысты. Тэхнік тэлестудыі. Прыехаў скараць літаратурны Мінск. За сяброўскім сталом, падгарачаныя, паэты не маглі не ўсчаць спрэчак. Асноўны кірунак удару прыйшоўся па Сысу. Яго дакаралі, наколькі помніцца, за знарочыстую арыгінальнасць, імкненне да эпатажу. Той, як мог, адбіваўся. Урэшце, зірнуўшы на мяне, сказаў прыкладна такое: «А вось і ў Яўгена ёсць падобны верш...» Меўся на ўвазе верш «Доля» («Вось мацерына доля...»).

Прыведзены выпадак паказвае, што ў самым пачатку ніхто не спяваў Анатолю асаблівых дыфірамбаў. Міф пра сябе ён настойліва ствараў самахоць. Але ніякая міфалогія не можа ўзнікнуць на голым месцы. У дадзеным выпадку яна была толькі падмацаваннем яго крэатыўнага патэнцыялу. Патэнцыял гэты, на жаль, цалкам не рэалізаваўся, хоць Анатоль Сыс застаўся ў беларускай паэзіі самабытнай з'явай.

— Калісьці ў 1980-х быў такі цудоўны літаратуразнаўчы тандэм — Яўген Гарадніцкі і Тамара Чабан... Які, на жаль, спыніўся ў сувязі з трагічнай ранняй смерцю спадарыні Тамары...

— Тамара Чабан... Дагэтуль (хоць мінула гэтулькі гадоў, нават дзесяцігоддзяў!) мой боль, мая туга.

Тамара вызначалася бясхібным адчуваннем сапраўднай паэзіі. У нашай бібліятэцы захоўваецца мноства зборнікаў вершаў, з якімі яна працавала. З яе пазнакамі на палях, з адзначанымі «птушачкамі» творамі, ацэнкамі ёю, у якіх яна адчула іскрыну сапраўднага пачуцця. Перачытваеш гэтыя вершы самых розных паэтаў — і пераконваешся ў дакладнасці і бездакорнасці яе выбару. У кожнай кнізе знаходзіліся ёю менавіта тыя вершы — самыя-самыя, якія неслі ў сабе галоўнае, найлепш адпавядалі стану душы паэта і жыццёвай праўдзе. Тамара Чабан годна прадаўжала традыцыі таго крытычнага кірунку (найбуйнейшым прадстаўніком якога быў Рыгор Бярозкін), для якога найважнейшым сведчаннем высокай паэзіі была яе жыццёвая падаснова, рэальная, насамрэч перажытая неабходнасць у з'яўленні твора.

Літаратурна-крытычныя працы Тамары Чабан і сёння маюць свайго чытача. На іх даволі часта спасылаюцца сучасныя даследчыкі, знаходзячы ў іх развагі і высновы, сугучныя нашаму часу, ідэі, актуальныя для літаратуры XXI стагоддзя.

— Трохі пра планы...

— Працаваць ёсць над чым. У планах, дарэчы, укладанне кнігі выбраных прац Тамары Чабан, напісанне ўступнага артыкула. Працягваю работу над кнігай, у якой будуць сабраныя выказванні беларускіх пісьменнікаў пра мастацтва і літаратурную творчасць. Неўзабаве завершыцца падрыхтоўка манаграфіі пра беларускую літаратуру другой паловы XX стагоддзя і яе эстэтыку.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

МАРШАЛ САКАЛОЎСКІ: ХТО КАЗАЎ,

...4 кастрычніка 1941 года рэзідэнт савецкай разведкі ў Японіі Рыхард Зорге адправіў у Маскву сваю апошнюю радыёграму:
«Начальніку разведупраўлення Генштаба Чырвонай Арміі
Токіа, 4 кастрычніка 1941 года
Радыётэлеграф
«Толькі 3000 розных грузавікоў і іншых машын былі накіраваны (гаворка ідзе пра перакідванне з Паўночнага Кітая ў Манчжурыю. — Рэд.). 1000 грузавікоў перад гэтым былі перакінутыя з Манчжурыі ў Паўночны Кітай. На працягу першых тыдняў падрыхтоўкі выступлення супраць СССР камандаванне Квантунскай арміі распарадзілася прызваць 3000 вопытных чыгуначнікаў для ўстанаўлення ваенных зносін па сібірскай магістралі, але цяпер гэта ўжо адменена. Усё гэта азначае, што вайны ў бягучым годзе не будзе».

Праз некалькі дзён Рыхарда Зорге арыштавала японская паліцыя. Гэтая яго апошняя радыёграма з'яўлялася, бадай, адной з самых важных у шматгадовай паспяховай кар'еры Зорге — яна дазваляла савецкаму кіраўніцтву прыняць важнае (і, як потым аказалася, шмат у чым лёсавызначальнае) рашэнне аб перакідванні дзясяткаў свежых дывізій з Далёкага Усходу пад Маскву. Галоўнае цяпер было выстаяць некалькі тыдняў да іх падыходу і вызначыць момант, калі немцы пачнуць выдыхацца. Гэтая задача клалася галоўным чынам на плечы начальнікаў штабоў, і перш за ўсё — на начальніка штаба Заходняга фронту Васіля Данілавіча Сакалоўскага. Камандаваць жа фронтам за тыдзень да гэтага быў прызначаны генерал арміі Георгій Жукаў.

Баі ішлі ўжо за 80 км ад сталіцы

У гэты час пачаліся праліўныя дажджы. Немцы вымушаны былі спыніцца, каб правесці перагрупоўку. Наступленне на Маскву з новымі сіламі яны аднавілі толькі 15 лістапада. Вораг імкнуўся абысці Маскву з поўначы і з поўдня. 23 лістапада быў захоплены Клін, неўзабаве яго 4-я танкавая група, якая наступала ў паласе 16-й арміі генерал-лейтэнанта Канстанціна Ракасоўскага, ушчыльную падышла да горада Істра разам з часцямі элітнай дывізіі СС «Дас Райх». Тут іх і спыніла 78-я сібірская дывізія палкоўніка Афанасія Белабародава. Вулічныя баі сібіракоў з ворагам часта пераходзілі ў рукапашныя сутычкі. Гэты ўчастак знаходзіўся пад кантролем штаба фронту, і Белабародаў адразу пазнаў у трубцы глухаваты голас Сакалоўскага:

— Здаў Істру?

— Здаў...

— Дрэнна. Возьмеш яе назад.

— Вазьму, таварыш генерал!

Слова сваё сібіракі стрымалі.

У ноч на 28 лістапада баявая група немцаў захапіла непашкоджаны мост праз канал Масква-Волга і імклівым ударам уварвалася ў Яхраму. Яшчэ праз пару дзён вораг захапіў Красную Паляну (Лобню) і быў ужо за 17 км ад мяжы Масквы і за 27 км ад Крамля. Панфілаўская дывізія вяла жорсткія баі за Крукава, станцыя восем разоў пераходзіла з рук у рукі. Стварылася пагроза акружэння 16-й арміі і захопу сталіцы.

І вось у гэты крытычны момант сказаў сваё слова начальнік штаба фронту Васіль Сакалоўскі. Ён адчуў, што немцы выдыхаюцца, бо тыя ішлі на ўсход па «беласнежных палях», не маючы ўяўлення, што іх чакае наперадзе. А там ужо бесперапынна выгружаліся сібірскія палкі. Сакалоўскі сачыў за суадносінамі сіл і дакладваў пра гэта Жукаву. 29 лістапада Жукаў патэлефанаваў Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму і прапанаваў нанесці контрудар. Позна ўвечары 29 лістапада Стаўка прыняла рашэнне аб пачатку контрнаступлення і запатрабавала ад Ваеннага савета Заходняга фронту план аперацыі. Дадзены план быў распрацаваны Васілём Данілавічам Сакалоўскім на працягу адной ночы і прадстаўлены раніцай 30 лістапада ў выглядзе карты з тлумачальнай запіскай. Гэтая запіска, напісаная рукой Сакалоўскага, на якой стаяць подпісы яго, Георгія Жукава і члена Ваеннага савета Мікалая Булганіна, была нядаўна апублікавана. На ёй размашыста напісана: «ЗГОДНЫ». І подпіс: «СТАЛІН».

Ужо 5 снежня нямецкія войскі былі вымушаныя перайсці да абароны па ўсім фронце, а неўзабаве пад ударамі савецкіх войскаў пакаціліся на захад.

«Генеральнае наступленне» на маскоўскім напрамку, як мы ведаем, дорага абышлося ворагу. Па даных начальніка штаба германскіх сухапутных войскаў генерала Гальдэра, страты нямецка-фашысцкіх войскаў толькі ў кастрычніку 1941-га склалі 135 тысяч. Па прызнанні нямецкіх генералаў — удзельнікаў бітваў, яны былі ашаломленыя сілай супраціўлення савецкіх войскаў і сваімі вялізнымі стратамі на подступах да Масквы. Так, начальнік штаба 4-й палявой арміі генерал Блюментрыт прызнае:

> *«Калі мы ўшчыльную падышлі да Масквы, настрой нашых камандзіраў і войскаў раптам рэзка змяніўся. Са здзіўленнем і расчараваннем мы выявілі ў кастрычніку і пачатку лістапада, што «разгромленыя рускія» зусім не перасталі існаваць як ваенная сіла».*

Камандуючы той жа арміяй генерал Клюге, грунтуючыся на вялікіх стратах яго арміі ў канцы кастрычніка і лістах салдат дадому, раіў камандаванню групы войскаў «Цэнтр» адкласці наступленне на Маскву да вясны 1942 года.

На вучэннях Маскоўскай ваеннай акругі з маршаламі С. Будзённым і К. Варашылавым, 1938 год.

Гітлераўскі план «маланкавай вайны» супраць СССР цалкам праваліўся. Нямецка-фашысцкая армія была вымушана ўпершыню з пачатку Другой сусветнай перайсці да абароны. Замест чаканай хуткай перамогі фашысцкая Германія ўстала перад фактам зацяжной і ў выніку — пройгрышнай вайны. Перамога Чырвонай Арміі пад Масквой аказала таксама вялікі ўплыў на ход ваенных аперацый і на іншых участках ваенных дзеянняў, спрыяла яшчэ большаму згуртаванню краін антыгітлераўскай кааліцыі, дзе ўбачылі, што немца можна біць.

...У сям'і маршала Сакалоўскага як рэліквія захоўваецца ліст, які Васіль Данілавіч у 1965 годзе напісаў у ЦК КПСС. У ім гаворыцца пра тое, што Масква, каля сцен якой восенню 1941 года былі разбітыя гітлераўскія полчышчы, што не ведалі паражэнняў, незаслужана забытая і што неабходна прысвоіць Маскве званне Горада-героя. Гэты ліст разам з ім падпісалі таксама маршалы Савецкага Саюза Іван Конеў і Канстанцін Ракасоўскі. Унучка маршала, Наталля Яўгенаўна Сакалоўская-Сінюкова, так успамінае расказы Васіля Данілавіча пра вайну:

> *«Калі мы пасля вайны жылі ў Хлебным завулку і я вучылася ў інстытуце, то ўвесь час пыталася ў яго, які з перыядаў Вялікай Айчыннай яму больш за ўсё запомніўся. І ён нязменна адказваў, што гэта была бітва за Маскву»...*

«Афіцэры» пісаліся з яго

Нарадзіўся будучы маршал 21 ліпеня 1897 года ў вёсцы Козлікі Гродзенскай губерні, у беднай сялянскай сям'і. Пасля заканчэння двухкласнай настаўніцкай школы ён некаторы час працаваў сельскім настаўнікам. У 1914 годзе паступіў у настаўніцкую семінарыю ў горадзе Невелі Вялікалуцкага павета (цяпер — Пскоўская вобласць). Тут жа ён браў удзел у рабоце студэнцкага рэвалюцыйнага гуртка. Царская ахранка напала на след гуртка, а ўсе ўдзельнікі, у тым ліку і Васіль Данілавіч, трапілі пад следства, якое было прыпынена толькі Лютаўскай рэвалюцыяй. У пачатку 1918 года Сакалоўскі заканчвае настаўніцкую семінарыю, аднак працаваць педагогам яму не прыйшлося. Ішла Грамадзянская вайна, і Васіль Сакалоўскі ўступіў добраахвотнікам у рады Чырвонай Арміі. Неўзабаве яго залічылі на 1-я Савецкія Маскоўскія пяхотныя камандныя курсы РСЧА, а затым, паспеўшы паваяваць з белачэхамі і белагвардзейцамі на Урале і нават стаць памочнікам камандзіра палка, у ліку першых 183 слухачоў ён быў накіраваны ў Акадэмію генеральнага штаба. Вясной 1920 года Васіль Данілавіч ў якасці начальніка штаба 32-й стралковай дывізіі 11-й арміі аднаўляе савецкую ўладу ў Баку, ваюе з інтэрвентамі і дзянікінцамі на Каўказе. Захварэўшы на тыф, ён знаёміцца з Ганнай Бажэнавай, агітатарам 11-й арміі, якая літаральна выхадзіла яго ў шпіталі. Пазней яны зноў сустрэліся ў Маскве і ўжо больш не расставаліся да канца жыцця.

Ваенную акадэмію Сакалоўскі скончыў восенню 1921 года. Скончыў бліскуча, у ліку трох найбольш паспяховых слухачоў. Пасля ўрачыстага сходу ў кабінеце начальніка акадэміі яго спыталі:

— Дзе хочаце працягваць службу?

Васіль Данілавіч адказаў не задумваючыся:

— Там, куды пашле камандаванне.

— Вам як курсанту, які выдатна скончыў Акадэмію, даецца права выбару далейшага месца службы.

— Маё месца там, — адказаў гэтак жа цвёрда Сакалоўскі, — дзе я больш за ўсё буду патрэбны.

— Самі разумееце, цяпер самы гарачы Туркестанскі фронт.

4 кастрычніка 1921 года Васіль Данілавіч быў накіраваны ў Туркестан на барацьбу з басмачамі. Сакалоўскі на пасадзе начальніка аператыўнага аддзела штаба Туркестанскага фронту з дапамогай легендарнага разведчыка Хамракула Турсункулава, кавалера ордэна Чырвонага Сцяга, а ў далейшым — старшыня знакамітага калгаса «Зорка Усходу», тройчы Героя Сацыялістычнай Працы, стварае разам з органамі Туркестанскай НК разведвальную агентурную сетку, якая вельмі дапамагла ў ліквідацыі Ферганскага басмацтва.

Басмачы адказвалі тэрорам. Аднойчы яны падсыпалі атруту ў шклянку з вадой у кабінеце Сакалоўскага. Ён выпіў і, як мёртвы, паваліўся на падлогу. Урачы канстатавалі смерць і адправілі цела ў морг. Уначы Васіль Данілавіч апрытомнеў і выбраўся з-пад кучы трупаў, якімі ўжо быў завалены. Іншым разам падасланы басмачамі чалавек стрэліў у яго з ружжа ва ўпор у той момант, калі Сакалоўскі аб'язджаў строй чырвонаармейцаў. Аднак у момант стрэлу конь стаў дубка, і зарад прыйшоўся ў нагу. Раненне аказалася цяжкім, і Сакалоўскага прыйшлося адправіць у Маскву, дзе яму зрабілі аперацыю. Усе гэтыя эпізоды склалі сюжэтную канву выдатнага савецкага фільма «Афіцэры» (1971), у якім правобразам галоўных герояў сталі Васіль Данілавіч Сакалоўскі і Васіль Іванавіч Чуйкоў. 2 мая 1945 года ў Берліне яны разам прымалі капітуляцыю Берлінскага гарнізона, а пасля вайны з'яўляліся суседзямі па дачным пасёлку Працоўная-Паўночная.

На ваенных сцяжынах

У студзені 1928 года Васіля Данілавіча накіроўваюць на Курсы ўдасканалення вышэйшага начальніцкага саставу, якія ў тыя ж гады скончылі Георгій Жукаў, Іван Конеў, Канстанцін Ракасоўскі і іншыя будучыя палкаводцы. Пасля таго на працягу 5 гадоў ён камандаваў 43-й стралковай дывізіяй Беларускай ваеннай акругі, у 1935 годзе быў пераведзены намеснікам начальніка штаба Прыволжскай ваеннай акругі. У тым жа годзе яго прызначаюць начальнікам штаба толькі што ўтворанай Уральскай ваеннай акругі. Пасля таго як 11 жніўня 1937 года выйшаў загад НКУС СССР № 00485 аб ліквідацыі мясцовых «дыверсійна-шпіёнскіх і паўстанцкіх кадраў», Сакалоўскі, гэтак жа як і Ракасоўскі, трапляе пад падазрэнне. Яго абвінавачваюць у тым, што ён схаваў факт службы ў царскай арміі і з'яўляецца белапольскім шпіёнам. У апошні момант Васіля Данілавіча ратуе яго жонка Ганна Пятроўна, якая знайшла ў папцы з дакументамі мужа даведку, што пацвярджала: Васіль Сакалоўскі быў вызвалены ад прызыву ў імператарскую армію да заканчэння настаўніцкай семінарыі.

У красавіку 1938 года камдыў Сакалоўскі становіцца начальнікам штаба Маскоўскай ваеннай акругі, якой камандаваў Маршал Савецкага Саюза Сямён Міхайлавіч Будзённы. З гэтага моманту лёс Васіля Данілавіча непарыўна звязаны з Масквой, якую ён неўзабаве будзе абараняць, а затым да канца вайны кіраваць франтамі і штабамі на галоўным заходнім напрамку РСЧА аж да заканчэння вайны.

У снежні 1940 года Гітлер падпісвае сакрэтную Дырэктыву № 21 «Варыянт Барбароса» аб нападзенні на Савецкі Саюз. Літаральна праз некалькі дзён савецкая разведка з дапамогай Ільзы Шцёбе (аператыўны псеўданім «Альта») перадала яе змест у Маскву. Пачалася падрыхтоўка да вайны. У сакавіку 1941 года Палітбюро прымае рашэнне аб скрытай мабілізацыі 900 тысяч ваеннаслужачых запасу. Даўкамплектацыя войскаў даручана генерал-лейтэнанту Сакалоўскаму, які ў лютым 1941 года быў прызначаны намеснікам начальніка Генеральнага штаба Чырвонай Арміі па арганізацыйна-мабілізацыйных пытаннях. 13 мая па распараджэнні Генштаба да заходняй граніцы пачынае перакідвацца асабовы склад новых дывізій. Яны павінны былі прыбыць да новых месцаў дыслакацыі ў перыяд з 10 чэрвеня да 3 ліпеня. Аднак паколькі немцы напалі 22 чэрвеня, то з 939 эшалонаў з войскамі да месца прызначэння паспелі прыбыць толькі 83, 455 знаходзіліся ў дарозе, а 401 эшалон толькі-толькі пачынаў ставіцца пад пагрузку. Тым не менш, менавіта гэтыя дывізіі выканалі вырашальную ролю ў стабілізацыі фронту ў ліпені-жніўні пад Смаленскам, пасля таго як Заходні фронт, створаны на базе Заходняй асобай ваеннай акругі пад камандаваннем генерала арміі Дзмітрыя Паўлава, быў цалкам разгромлены немцамі ў першыя дні вайны ў Беластоцкім і Мінскім «катлах». 2 ліпеня камандуючым войскамі заходняга напрамку быў прызначаны Маршал Савецкага Саюза Сямён Цімашэнка, а начальнікам штаба — генерал-лейтэнант Васіль Сакалоўскі.

На працягу двух месяцаў (з 10 ліпеня да 10 верасня) на велізарнай тэрыторыі (600—650 км па фронце) разгарнулася грандыёзная Смаленская бітва.

Штаб фронту ў тыя дні працаваў самааддана і арганізавана, нягледзячы на складаную абстаноўку, у непасрэднай блізкасці ад месца баёў. У адзін з такіх дзён у кабінет Сакалоўскага ўбег задыханы ад'ютант і далажыў:

— Таварыш генерал, да штаба набліжаецца вялікая групоўка нямецкіх войскаў, штаб пад пагрозай удару і захопу ворагам.

Спакойны погляд Васіля Данілавіча слізгануў па твары капітана.

— Толькі без панікі. — Сакалоўскі глыбока ўздыхнуў і яшчэ больш спакойна спытаў: — Шмат фашыстаў?

ШТО ЎСЕ ШТАБНЫЯ — БАЯЗЛІЎЦЫ?!

— Каля палка, — адказаў ад'ютант.

— Та-а-ак, — працягнуў Сакалоўскі і зняў тэлефонную трубку. — Мне камандуючага.

Далажыўшы пра абставіны Жукаву і катэгарычна адмовіўшыся ад пераезду на новае месца, Сакалоўскі перадаў праз ад'ютанта свой чарговы загад:

— Штабу працягваць работу. Усім незанятым афіцэрам — на абарону штаба.

Вось у такія моманты ярка выяўляліся і чалавечыя, і палкаводчыя рысы характару Сакалоўскага.

У сувязі з хваробай начальніка Генеральнага штаба Маршала Савецкага Саюза Б. М. Шапашнікава ў пачатку 1942 года В. Д. Сакалоўскі нейкі час працуе першым намеснікам начальніка Генеральнага штаба. Неўзабаве яго зноў накіроўваюць на фронт, спачатку на пасаду начальніка штаба пры галоўнакамандуючым Заходняга напрамку, а пасля скасавання гэтага камандавання (май 1942-га — начальнікам штаба Заходняга фронту. У чэрвені 1942 года яму прысвойваецца воінскае званне генерал-палкоўніка.

Пасля ад'езду Г. К. Жукава ў Маскву ў сувязі з прызначэннем яго намеснікам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага генерал-палкоўнік В. Д. Сакалоўскі нейкі час выконваў абавязкі, а ў лютым 1943 года быў зацверджаны на пасадзе камандуючага войскамі Заходняга фронту. Летам таго ж года войскі Заходняга фронту пад камандаваннем Сакалоўскага (у жніўні яму было прысвоена воінскае званне генерала арміі) паспяхова правялі дзве наступальныя аперацыі — Арлоўскую ва ўзаемадзеянні з Бранскім і Цэнтральным франтамі і Смаленскую ва ўзаемадзеянні з Калінінскім фронтам.

Інспекцыя ад Сталіна

Пра значэнне Смаленскай наступальнай аперацыі сведчыць такі факт, што ў ходзе яе падрыхтоўкі, 3 жніўня 1943 года, на камандны пункт фронту ў раён Юхнава прыбыў Вярхоўны Галоўнакамандуючы І. В. Сталін, што, як вядома, здаралася вельмі рэдка.

Сталін запатрабаваў у Сакалоўскага далажыць яму абстаноўку на фронце. Нарада была нядоўгая. Камандуючы фронтам і яго бліжэйшыя памочнікі зрабілі вычарпальныя даклады Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму. Сталін даў указанні па арганізацыі і правядзенні аперацыі і з'ехаў у Маскву. Заходняму фронту была пастаўлена задача ва ўзаемадзеянні з Калінінскім фронтам прарваць абарону немцаў, разграміць іх смаленскую групоўку і выйсці на тэрыторыю Беларусі.

Смаленская наступальная аперацыя пачалася 7 жніўня і завяршылася ў кастрычніку 1943 года. Баі насілі выключна жорсткі характар. Нямецка-фашысцкае камандаванне бесперапынна ўзмацняла сваю групоўку перакідкай злучэнняў з іншых напрамкаў (з 1 да 18 жніўня, напрыклад, было падцягнута з іншых участкаў 11 дывізій). Аднак стрымаць наступленне войскаў Чырвонай Арміі праціўнік не мог. Войскі фронту прасунуліся на 200 кіламетраў на захад, нанеслі сур'ёзнае паражэнне групе армій «Цэнтр», вызвалілі Смаленскую вобласць, старажытны горад Смаленск і ўступілі ў межы Беларусі.

За паспяховае правядзенне Смаленскай аперацыі В. Д. Сакалоўскі быў узнагароджаны другім ордэнам Суворава 1-й ступені.

Няўдачы пад Віцебскам

Узімку 1943—1944 гадоў Заходні фронт праводзіў лакальныя аперацыі ў раёне Віцебска і іншых рэгіёнах. Вялікіх поспехаў у гэтых баях фронт не дабіўся. Пасля некалькіх месяцаў наступлення і зацятых баёў ён не меў неабходных сіл і сродкаў для разгрому групоўкі нямецка-фашысцкіх войскаў у Беларусі. Вядзенню буйных наступальных аперацый зімой не спрыяў і раён дзеянняў. Вось як пра гэта ўспамінаў сам Васіль Данілавіч:

«Я як камандуючы Заходнім фронтам асабіста дакладваў Вярхоўнаму Галоўнакамандуючаму, што ўмовы мясцовасці — гэтага лясіста-балоцістага дэфіле — не дазваляюць весці зімой шырокія наступальныя дзеянні нават пры наяўнасці неабходных сіл, і прасіў шукаць рашэнні на поўнач або на поўдзень ад «Смаленскіх варотаў».

Аднак Стаўка, ведаючы аб усіх цяжкасцях, якія выпрабоўвалі войскі фронту, тым не менш патрабавала працягваць наступленне. Для яе ў тых умовах было важна, каб войскі Сакалоўскага працягвалі актыўна скоўваць сілы ворага, не даваляючы яму перакідваць іх на іншыя ўчасткі савецка-германскага фронту.

На Украінскім фронце

12 красавіка 1944-га Заходні фронт быў падзелены на два — 2-і і 3-і Беларускія. А яго камандуючы быў прызначаны на пасаду начальніка штаба 1-га Украінскага фронту.

Неўзабаве В. Д. Сакалоўскі прыбыў да новага месца службы. А ўслед за гэтым у камандаванне Першым Украінскім фронтам уступіў Маршал Савецкага Саюза І. С. Конеў. Не першы раз сыходзіліся ваенныя дарогі гэтых двух выдатных ваеначальнікаў, ім не трэба было знаёміцца адзін з адным і спрацоўвацца. Васіль Данілавіч адразу ж па прыездзе цалкам акунуўся ў звыклую і клапатлівую стыхію работы вялікага штаба.

24 чэрвеня Стаўка паставіла яму задачу падрыхтаваць і правесці аперацыю з мэтай разграміць групоўку праціўніка на львоўскім напрамку. Фронт прыступіў да планавання аперацыі, якая ў далейшым атрымала назву Львоўска-Сандамірскай. Планаванне такой аперацыі з'яўлялася складанай задачай. Першы Украінскі фронт меў у сваім складзе

12 ліпеня 1945 года фельдмаршал Мантгомеры ўсклаў на В. Д. Сакалоўскага (*на заднім плане*) Крыж рыцара ордэна Брытанскай імперыі ваеннага класа (Берлін, каля Брандэнбургскіх варотаў).

Тое ж самае дакладваў у Стаўку ВГК і яе прадстаўнік на Заходнім фронце маршал артылерыі М. М. Варанаў.

Застаецца яшчэ дадаць, што ў тую зіму 1944 года балоты, разрытыя торфараспрацоўкі Аршанскай ДРЭС з-за няўстойлівасці зімы і частых адліг не замерзлі, а толькі пакрыліся снегам. Не толькі танкі, але і людзі нечакана правальваліся ў багну.

сем агульнавайсковых, тры танкавыя і дзве паветраныя арміі — гэта ўвогуле 80 дывізій, акрамя многіх злучэнняў і часцей узмацнення. У яго складзе быў і Першы Чэхаславацкі корпус пад камандаваннем генерала Свабады. Планаванне аперацыі ажыццяўлялі асабіста Конеў, Сакалоўскі і невялікая група штабных генералаў і афіцэраў.

Камандуючы Заходнім фронтам, люты, 1943 год.

Былы нямецкі генерал Меленцін пісаў з нагоды паражэння ў міжрэччы Віслы і Одэра (Вісла-Одэрскую аперацыю таксама распрацоўваў генерал Сакалоўскі):

«...Рускае наступленне развівалася з нябачанай сілай і імклівасцю. Было ясна, што іх вышэйшае камандаванне цалкам авалодала тэхнікай арганізацыі наступлення велізарных механізаваных войскаў. Немагчыма апісаць усё, што адбылося паміж Віслай і Одэрам у першыя месяцы 1945 года. Еўропа не ведала нічога падобнага з часу гібелі Рымскай імперыі».

У Берліне

Увесну 1945 года 1-ы Украінскі фронт адначасова з 1-м і 2-м Беларускімі франтамі разгарнуў падрыхтоўку Берлінскай аперацыі — завяршальнай аперацыі Вялікай Айчыннай вайны.

А перад самым пачаткам аперацыі рашэннем Стаўкі генерал В. Д. Сакалоўскі быў прызначаны першым намеснікам камандуючага войскамі 1-га Беларускага фронту.

У апошнія і вырашальныя дні Вялікай Айчыннай вайны, як і ў перыяд бітвы за Маскву, ён, такім чынам, зноў апынуўся разам з маршалам Г. К. Жукавым, працуючы пад яго камандаваннем.

Ноччу 1 мая лінію фронту перайшоў начальнік штаба сухапутных войскаў Германіі генерал пяхоты Крэбс. Перагаворы з ім ад імя савецкага камандавання вёў намеснік камандуючага 1-м Беларускім фронтам, генерал арміі Васіль Сакалоўскі. Генерал Крэбс заявіў Сакалоўскаму, што Гітлер скончыў жыццё самагубствам, створаны новы ўрад, і ён упаўнаважаны прасіць умоў перамір'я. Васіль Данілавіч патэлефанаваў камандуючаму фронтам Жукаву і далажыў:

— Нешта яны хітраць, Крэбс просіць міру, але заяўляе, што не ўпаўнаважаны вырашаць пытанні аб безумоўнай капітуляцыі. Гэтае пытанне, паводле яго слоў, можа вырашаць толькі новы ўрад Германіі на чале з Дзёніцам. Крэбс дамагаецца перамір'я нібыта для таго, каб сабраць у Берліне ўрад Дзёніца. Думаю, нам варта катэгарычна патрабаваць безумоўнай капітуляцыі.

— Безумоўна, — ухваліў рашэнне Сакалоўскага Жукаў.

Атрымаўшы ўмовы капітуляцыі, Крэбс адправіўся назад. Увечары таго ж дня ён застрэліўся ў бункеры Гітлера.

У Берлінскай аперацыі з новай сілай выявіўся палкаводчы талент Васіля Данілавіча Сакалоўскага. Даючы яму службовую характарыстыку ў ліпені 1945 года, Галоўнакамандуючы Групы савецкіх акупацыйных войскаў у Германіі Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў адзначаў:

«Высокай культуры, з вялікай ваеннай эрудыцыяй і арганізатарскімі здольнасцямі генерал. Валодае вялікай сілай волі і цвёрдасцю характару, адважны і энергічны, рашучы і ініцыятыўны, пастаянна патрабавальны да сябе і падначаленых. У перыяд Берлінскай аперацыі непасрэдна кіраваў баявымі дзеяннямі па авалоданні Берлінам і паспяхова выконваў заданні камандавання фронтам».

Высока ацаніў ратны подзвіг Васіля Данілавіча Сакалоўскага ў Берлінскай аперацыі савецкі ўрад. Яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

А ў 1946 годзе быў апублікаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб прысваенні Васілю Данілавічу Сакалоўскаму найвышэйшага воінскага звання Маршал Савецкага Саюза.

...У сакавіку 1946 года В. Д. Сакалоўскі быў прызначаны Галоўнакамандуючым Групы савецкіх акупацыйных войскаў у Германіі. Адначасова ён з'яўляўся членам кантрольнага савета ад СССР па кіраванні Германіяй, куды ўваходзіла па адным прадстаўніку ад ЗША, Вялікабрытаніі і Францыі.

Гэтым часам у савецкай зоне акупацыі, як і ва ўсёй Германіі, не было нямецкага ўрада. На савецкую ваенную адміністрацыю ўскладалася кіраванне палітычным, эканамічным і культурным жыццём нямецкага народа ва Усходняй зоне. У яе задачу ўваходзілі правядзенне дэмілітарызацыі, дэнацыфікацыі, адмена фашысцкага заканадаўства, дэмакратызацыя ўсяго жыцця, ліквідацыя найбольш цяжкіх наступстваў вайны, нармалізацыя жыцця, аднаўленне эканомікі, арганізацыя забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання і таварамі першай неабходнасці і г. д.

Савецкая ваенная адміністрацыя выконвала свае абавязкі да 1949 года, калі быў створаны часовы ўрад Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі.

У сакавіку 1949 года В. Д. Сакалоўскі быў прызначаны першым намеснікам міністра абароны СССР, а ў ліпені 1952-га — начальнікам Генеральнага штаба Савецкіх Узброеных Сіл і першым намеснікам міністра абароны. Васіль Данілавіч прыйшоў на гэтыя адказныя пасады, валодаючы высокай культурай, глыбокімі ведамі ў ваеннай справе, велізарным вопытам камандзіра і штабной работы, вялікім палітычным багажом.

Больш за адзінаццаць гадоў В. Д. Сакалоўскі працаваў у Міністэрстве абароны, з іх восем гадоў на пасадзе начальніка Генеральнага штаба. Па абавязку службы маршал актыўна ўдзельнічаў у распрацоўцы дырэктыўных указанняў, задум і планаў правядзення буйных вучэнняў і ваенных гульняў, многія з іх праходзілі пад яго непасрэдным кіраўніцтвам. Нярэдка яму самому даводзілася кіраваць такімі вучэннямі і ваеннымі гульнямі ў войсках і ў ваенных акадэміях. Васіль Данілавіч клапаціўся пра тое, каб усе мерапрыемствы аператыўнай падрыхтоўкі адлюстроўвалі самы перадавы ўзровень развіцця ваеннай навукі і ваеннага мастацтва.

Гэта быў перыяд якасных змен у савецкай арміі, з'яўлення новых відаў войскаў — ракетных, стратэгічных ядзерных сіл авіяцыі і флоту, змены стратэгіі і тактыкі ваеннай справы. Васіль Данілавіч праявіў сябе ў гэтыя гады як найбуйнейшы тэарэтык, ён — аўтар фундаментальных прац «Ваенная стратэгія» і «Разгром нямецка-фашысцкіх войскаў пад Масквой».

Часта з'яўляліся яго артыкулы на старонках ваенных і неваенных часопісаў —- не толькі савецкіх, але і за мяжой.

Увечары 30 красавіка 1968 года, напярэдадні Першага мая, Васіль Данілавіч раптоўна занядужаў. Урачы аказаліся бяссільныя чым-небудзь дапамагчы, і ў ноч на 10 мая яго сэрца перастала біцца. Урна з прахам маршала змешчана ў Крамлёўскай сцяне.

У яго гонар названы вуліцы ў Маскве, Смаленску і Гродне, а яго памяці прысвечана частка экспазіцыі ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі, імем маршала названа вышэйшае ваеннае каманднае вучылішча сувязі ў Новачаркаску, якое праіснавала да 2011 года.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

У матэрыяле выкарыстаны звесткі з літаратуры:

- **Лагодский С. А. Василий Соколовский: полководец, стратег, дипломат. — М.: «Красная звезда», 1995.**
- **Маршалы Советского Союза. Личные дела рассказывают / Институт военных и историко-патриотических исследований. — М.: Любимая книга, 1996.**
- **Маршал Василий Соколовский. — М.: Издательство Патриот, 2017.**
- **Соловьев Д. Ю. Все генералы Сталина. — М., 2019.**
- **Чередниченко М. Маршал Советского Союза Василий Соколовский // Полководцы и военачальники Великой Отечественной.**

У сезон

ПРАВІЛЫ ЧАМАДАНА

Парады па зборы ў адпачынак ад розных спецыялістаў

Пара ў адпачынак? Паехалі! Куды б вы ні накіроўваліся — да мора, у санаторый у межах краіны ці проста на лецішча, пытанне «Што пакласці ў чамадан, а што пакінуць дома?» цяпер актуальнае для многіх. Мы спыталі пра гэта розных спецыялістаў і гатовыя расказаць вам, як сабрацца ў падарожжа.

ВАЗЬМІЦЕ Ў ДАРОГУ СПІС РЭЧАЎ

Вольга КАЛАСОЎСКАЯ, дыэктар турагенцтва

— Простае і відавочнае правіла, якое складана выканаць: не трэба браць з сабой лішняе. Чым менш рэчаў вы возьмеце, тым камфортнейшая будзе ваша дарога. Пры гэтым неабходнасць кожнай узятай з сабой рэчы павінна быць сур'ёзна абдумана.

• Складзіце спіс рэчаў. Зрабіць гэта лепш за некалькі дзён да збору чамадана. Потым паспрабуйце выкрасліць са спіса ўсё, што толькі зможаце.

• Гэты спіс пакладзіце ў чамадан — ён дапаможа вам нічога не забыць у атэлі, калі вы будзеце збірацца ў зваротны шлях.

• Як правіла, гасцініцы, санаторыі, атэлі даюць на сваіх сайтах апісанне нумароў. Не лішняе загадзя азнаёміцца з пералікам таго, што ёсць у нумары, дзе вы будзеце жыць. Можа быць, фен, напрыклад, вам браць з сабой не трэба — ён ёсць у нумары. Тое ж датычыцца шампуню, гелю для душу, кіпяцільніка (у нумары можа быць электрачайнік).

— Мая парада: збярыце ўсе рэчы, якія хочаце ўзяць у дарогу, у адзін стос, і прыбярыце лішняе ў тры заходы (з інтэрвалам у некалькі гадзін). Вы заўважыце, колькі непатрэбнага набралі спачатку!

Цяпер, уласна, збіраем чамадан.

• Найбольш цяжкія рэчы, якія займаюць максімум месца (курткі, рушнікі, плед і г. д.), кладзём на дно чамадана роўным пластом.

• Абутак — па адным, а не парай — выкладваем уздоўж сценак. Лепш за ўсё кожны кед, красовак або «басаножак» спакаваць у асобны цэлафанавы пакет.

• Адзенне не складваем, а скочваем у тугі, шчыльны «рол» — можна кожную рэч асобна, можна ўсё адзенне разам, склаўшы яго пластамі. Так рэчы не пакамечацца падчас пераезду.

• Самае лёгкае кладзём у сярэдзіну чамадана. Сюды ж, паміж мяккім — усё крохкае і тое, што б'ецца. Цвёрдыя плоскія рэчы — напрыклад, пляжную сумку або кнігу — кладзём зверху. Так контуры чамадана будуць цвёрдыя і вы давязеце свае рэчы да месца прызначэння ў парадку — гэтак жа, як склалі.

БЕЛАЯ ФУТБОЛКА — MUST-HAVE АДПАЧЫНКУ

Вольга ЖУРАЎСКАЯ, стыліст

— Падбор гардэроба для адпачынку выклікае ў людзей нямала складанасцяў. У адных, на іх думку, няма ў шафе нічога прыдатнага для падарожжаў, іншыя спрабуюць уціснуць у чамадан увесь свой гардэроб. Але яшчэ горш тое, што значная частка нашых турыстаў, наадварот, не задумваецца, як выглядаць адпаведна абставінам, і аддае перавагу толькі асабістаму камфорту. Або іншая крайнасць — бяруць з сабой усё самае прыгожае і найлепшае, не лічачыся з тым, куды едуць.

• Першае правіла збораў — дакладнае ўяўленне аб маючым адбыцца падарожжы. Улічыце геалакацыю, паглядзіце прагноз надвор'я там, куды вы едзеце. Падумайце пра тое, як будзе праходзіць ваш дзень (плануеце вы экскурсіі або ляніва дні на пляжы, паходы ў клубы або вячэрнія прагулкі ўздоўж марскога берага, будзеце жыць у адным атэлі ці пераязджаць з месца на месца, узяўшы ў арэнду машыну).



• Вырашыце, якія мэты вы ставіце перад сабой. Адпачыць, загарэць, выспацца? Убачыць як мага больш славутасцяў? Часам людзі плануюць сумяшчаць адпачынак з дзелавымі сустрэчамі. А часам — спадзяюцца сустрэць каханне.

• Важна разумець, якія будуць экскурсіі і дзе яны будуць праходзіць. Бываюць выпадкі, калі турысты, напрыклад, з 35-градуснай гарачыні адпраўляюцца на экскурсію ў падзямеллі, дзе тэмпература — «каля нуля».

— Поспех вашага «гардэроба для адпачынку» ацэньваецца магчымасцю скласці стыльныя вобразы на ўсе выпадкі, якія вы прадугледжваеце, каб не выглядаць камічна ў пляжных шортах сярод крухмальных абрусаў і афіцыянтаў у белых пальчатках. Ці не фарсіць на пляжы з класічнай сумачкай у спалучэнні з камплектам спартыўнага стылю.

• Такім чынам, «капсула» для адпачынку залежыць ад таго, куды і навошта вы адпраўляецеся. Але ёсць і агульныя правілы. Па-першае, вазьміце з сабой простую белую футболку і простую белую кашулю.

— Такая кашуля (як і футболка) ніколі не будзе лішняя і заўсёды выручыць, калі вы не разлічвалі на фармальныя або свецкія выхады, а яны раптам «намаляваліся». Да таго ж кашулю можна завязаць вузлом на таліі паверх звычайнага топа і стварыць шматслаёвы стыльны вобраз для пляжнай вечарынкі ці клубнай дыскатэкі.

• Не варта браць у адпачынак рэчы, якія вы не носіце ў штодзённым жыцці. У іх вы не будзеце адчуваць сябе камфортна.

— Напрыклад, я часта развейваю перакананні маіх кліентак, што ў адпачынку не абысціся без шортаў. Тым, каго шорты робяць больш прывабнымі, з радасцю падбіраю іх у розных стылях. Але калі вы не любіце шорты або джынсы, у адпачынку можна абысціся і без іх — трэба толькі выбраць спадніцы, сукенкі і сарафаны, якія будуць адпавядаць абстаноўцы.

Дарэчныя будуць сарафаны і спадніцы ў марскім стылі, у папулярным цяпер стылі боха або этна-стылі. Такія вобразы выглядаюць расслаблена і атаясамліваюцца з адпачынкам.

— Вазьміце з сабой белы сарафан ці сукенку — для летняга адпачынку гэта самая ўніверсальная рэч, якую можна адаптаваць да любой сітуацыі. Няхай ён будзе з простай баваўны — гэта лепш, чым занадта карункавы. З дапамогай аксесуараў вы зможаце стварыць стыльны вобраз на любы выпадак.

• Выдатна дапоўняць гардэроб для адпачынку касцюмы з тонкага трыкатажу, сукенкі ў спартыўным стылі накшталт доўгіх футболак або світшотаў, джынсавыя рэчы — яны выглядаюць актуальна, не камячацца і не патрабуюць адмысловага догляду.

• Звярніце ўвагу на доўгія рэчы, якія носяць «другім пластом» — сукенкі-кашулі, кардыганы, камізэлькі і г. д.

— Узяўшы з сабой што-небудзь з пералічанага, акрамя цеплавога рэжыму (вечарамі можа спатрэбіцца накінуць нешта зверху) вы будзеце выглядаць яшчэ і стыльна.

• І, нарэшце, абутак — тыя ж крытэрыі: камфорт і дарэчнасць.

— На шчасце, трэнд насіць спартыўны абутак з любым адзеннем ужо стаў звыклай базай. Уявіць сабе нешта больш зручнае для адпачынку практычна немагчыма.

• Сумкі — з сабой ідэальна мець заплечнік і· невялікую сумку-кросбодзі або паясную. Такія варыянты можна адаптаваць да любога «адпускнога» вобразу.

• У завяршэнне — аксесуары.

— Вось ужо чым я раю не грэбаваць! Аксесуары не зойміць шмат месца, але дададуць у вобраз акцэнты.

НЕ ЗАБУДЗЬЦЕСЯ НА РЭЦЭПТ

Вераніка АЛЯХНОВІЧ, загадчыца аддзялення агульнай урачэбнай практыкі паліклінікі

— Наяўнасць аптэчкі — абавязковая ўмова любога падарожжа, няхай гэта паездка да мора, паход да возера з палаткай або проста выезд на некалькі дзён на лецішча.

• Набор сродкаў у аптэчцы залежыць ад таго, куды вы накіроўваецеся. На трапічным моры вам наўрад ці спатрэбіцца спрэй ад кляшчоў і камароў, а вось на Мінскае мора (або любое айчыннае возера) лепш узяць яго з сабой.

• Перш за ўсё пакладзіце ў аптэчку прэпараты, якія вы і вашы спадарожнікі прымаеце пастаянна. Гэта лекі ад хранічных захворванняў (ціску, астмы і г. д.). А таксама прэпараты, якія вы прымаеце пры абвастрэнні хранічных хвароб.

— Калі вы ляціце на адпачынак у іншую краіну, важна ведаць не толькі гандлёвую, але і міжнародную назву дадзеных прэпаратаў, — падкрэслівае спецыяліст. — Яна звычайна пазначана ва ўкладышы-інструкцыі да лекаў. У самалёт бярыце толькі тое, што неабходна на час палёту, астатнія медыкаменты адпраўце ў багаж.

• Вазьміце інструкцыі да лекаў. Калі справа даходзіць да аптэчкі, папросту можна знервавацца, забыцца пра дазіроўкі і сумяшчальнасць з іншымі прэпаратамі. Поўную версію інструкцыі можна захоўваць у смартфоне, а ў аптэчку пакладзіце спіс лекаў з кароткімі тлумачэннямі і схемай прыёму. Каб важны ліст не парваўся, заклейце яго з двух бакоў скотчам.

• Праверце тэрміны прыдатнасці. Пераканайцеся, што лекі не пратэрмінаваныя, асабліва калі бераце іх з дамашняй аптэчкі. Праверце, што на адкрытай упакоўцы ёсць назва і тэрмін прыдатнасці. Пачаты блістар таблетак, на якім не відаць назву лекаў, лепш замяніць на цэлы. Так вы пазбегнеце лішніх пытанняў на граніцы і не забудзеце, што за прэпарат узялі з сабой.

• Прачытайце ўмовы захоўвання, пераканайцеся, што лекі не сапсуюцца ў падарожжы. Магчыма, вам спатрэбіцца сумка-халадзільнік: не палохайцеся, яны бываюць памерам з касметычку.

• Па магчымасці замяніце вадкія прэпараты на таблеткі і парашкі. Калі лекі трэба ўзяць менавіта ў вадкай форме, старайцеся купляць іх не ў шкляным, а ў пластыкавым флаконе.

• Будзьце асцярожныя з эканоміяй месца. Выкінуць аб'ёмныя кардонныя пачкі-скрынкі — добрая ідэя. Але калі ляціце за мяжу, усе лекі павінны лёгка ідэнтыфікавацца.

• Бярыце рэцэптурныя прэпараты з разумным запасам. У іншыя краіны часцей за ўсё дазваляюць увозіць лекі з разлікам на тры месяцы прыёму. Нават калі вы не збіраецеся так надоўга, жыццёва неабходных прэпаратаў (напрыклад, інсуліну) бярыце з запасам: раптам рэйс перанясуць ці вам прыйдзецца затрымацца.

• Да рэцэптурных прэпаратаў прыкладзіце рэцэпт або даведку ад урача — прад'явіце мытнікам, калі ўзнікнуць пытанні.

• «Галоўныя героі» вашай летняй «адпускной аптэчкі» — сродкі ад дыярэі, сродкі, якія дапамагаюць страваванню, гарачкапаніжальныя, супрацьалергічныя, лекі, што гояць траўмы, сродкі ад млоснасці, сродкі ад сонечных апёкаў.

— Пачнём са сродкаў пры нястраўнасці. Ёсць паняцце «дыярэя падарожнікаў», часцей яна ўзнікае пры паездках у трапічную і субтрапічную кліматычныя зоны, але можа здарыцца пры любой змене месца. Справіцца з праблемай дапамогуць супрацьмікробныя прэпараты, а флору кішэчніка адновіць «Лінэкс». Зразумела, у вашай аптэчцы павінны быць актываваны або «Белы вугаль» і «Смекта».

• Ферментныя прэпараты («Мезім», «Фестал») дапамогуць вам, калі вы няўдала пазнаёміліся з мясцовымі кулінарнымі традыцыямі.

• Не забудзьцеся на абязбольвальныя і спазмалітычныя сродкі — яны хутка ліквідуюць праблему мігрэняў і іншых болеў.

* Неабходныя гарачкапаніжальныя (яны, дарэчы, валодаюць абязбольваючым дзеяннем, а шэраг прэпаратаў таксама з'яўляецца супрацьзапаленчымі).

— Не забудзьцеся пакласці ў аптэчку прэпараты ад насмарку і ад кашлю, антысептык ад болю ў горле, — раіць суразмоўніца.

• Супрацьалергічныя прэпараты неабходныя ў дарозе, нават калі алергіі ў вас няма.

— Ніхто не можа спрагназаваць рэакцыю арганізма на новыя для яго ежу, расліны, укусы насякомых і г . д. Лепш мець пад рукой не толькі таблеткі, але і кроплі ў вочы, і антыгістамінны крэм.

• Ёд, бінт, бактэрыцыдны пластыр, перакіс або хлоргексідзін — must-have любога вандроўніка.

* Ну а сродкі супраць млоснасці асабліва спатрэбяцца, калі вы збіраецеся пакатацца на яхце або катары, а таксама калі ў тур вы едзеце на аўтобусе.

• Сродкі ад сонечных апёкаў лепш везці з сабой, чым купляць на месцы — кошты на іх у турыстычных месцах могуць непрыемна здзівіць. Захапіце «Бепантэн», а таксама сонцаахоўныя сродкі з высокім SPF.

— Ці браць з сабой антыбіётыкі? Так, калі вы ведаеце пра сябе, што часта хварэеце на інфекцыйныя захворванні дыхальных шляхоў. Бярыце тыя, якія вам звычайна прапісвае доктар. Лепш за ўсё, калі яны будуць шырокага спектру дзеяння.

• Едзеце ў адпачынак з дзіцем? Дадайце ў аптэчку дзіцячыя прэпараты па вышэйпрыведзеным спісе, а таксама кроплі ад атыту, супрацьвірусныя, заспакаяльныя сродкі.

• Самыя строгія абмежаванні датычацца наркатычных і псіхатропных рэчываў. Калі вы прымаеце нешта з гэтага спісу, паклапаціцеся аб наяўнасці рэцэпту або заключэння, падпісанага ўрачом. Не спрабуйце схаваць факт перавозкі такога рэчыва, абавязкова занясіце яго ў дэкларацыю і праходзьце праз чырвоны калідор.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Урожай призов в Виталюр!»

В настоящих правилах проведения рекламной игры «Урожай призов в Виталюр!» (далее – Правила) нижеперечисленные термины имеют следующее значение:

Карта «Виталюр» – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты лояльности «Виталюр» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером «Виталюр» (далее – Номер карты «Виталюр»), эмитированной ОДО «Виталюр», в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

Карта «Мощная картка» – идентификатор (инструмент) участника программы лояльности ОДО «Виталюр» в виде активной пластиковой карты «Мощная картка» с нанесенным на нее уникальным идентификационным номером (далее – номер карты «Мощная картка») и зарегистрированной в системе Программы лояльности ОДО «Виталюр», эмитированной ОАО «Белинвестбанк», ОАО «Белагропромбанк», ОАО «БПС-Сбербанк», ЗАО «Идея-Банк», ОАО «Банк БелВЭБ», ЗАО «Альфа-Банк», ЗАО «БСБ Банк», ОАО «Технобанк», ОАО «Паритетбанк», ЗАО «Банк «Решение», ЗАО «РРБ-Банк», в том числе для функционирования программы лояльности ОДО «Виталюр».

Персональные данные – совокупность личных данных физического лица, которые необходимо зарегистрировать (или проверить) на Интернет-сайте www.vitalur.by, а именно:

- фамилия (обязательно), имя (обязательно), отчество (обязательно, при наличии);
- адрес пребывания/проживания в Республике Беларусь: населенный пункт (обязательно), улица (обязательно, при наличии);
- адрес электронной почты (обязательно);
- абонентский номер мобильного телефона Участника в сети белорусского оператора сотовой связи в международном формате (обязательно).

Интернет-сайт – www.vitalur.by

1. Организатором рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, г. Минск, пер. Козлова, 25, пом. 22.

Электронный адрес: info_igra@vitalur.by

2. Наименование рекламной игры: «Урожай призов в Виталюр!»

3. Территория проведения игры: магазины «Виталюр» на территории Республики Беларусь (далее – магазины «Виталюр»).

4. Срок начала и окончания рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и опубликования результатов проведения рекламной игры: с 4 августа 2021 года по 30 октября 2021 года.

5. Состав комиссии по проведению рекламной игры:

Председатель комиссии:

Кривоногова Надежда Александровна – ведущий специалист по работе с клиентами ООО «ЭфСиБи Бел».

Члены комиссии:

Казак Вадим Анатольевич – специалист по рекламе ООО «Адверком»;

Бакач Татьяна Николаевна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Корпик Екатерина Игоревна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел»;

Страх Александра Вадимовна – специалист по рекламе ООО «ЭфСиБи Бел».

6. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится рекламная игра: товары, перечисленные в таблице 1 настоящего пункта (далее – Игровой товар), реализуемые в магазинах «Виталюр» на территории Республики Беларусь в период с 4 августа 2021 года по 29 сентября 2021 года включительно.

Таблица 1. **Игровые товары**

№	Наименование Игрового товара
1	Арахис двойной обжарки, соленый 120 г INTERSNACK
2	Арахис со вкусом меда 120 г INTERSNACK
3	Арахис в хрустящей оболочке_лук 125 г INTERSNACK
4	Арахис в хрустящей оболочке_острая паприка 125 г. INTERSNACK
5	Арахис в хрустящей оболочке_паприка 125 г INTERSNACK
6	Арахис жареный соленый 200 г INTERSNACK
7	Арахис жареный соленый 70 г INTERSNACK
8	Арахис соленый 120 г INTERSNACK
9	Чипсы ОНЕГА из сырого картофеля со вкусом краба 75 г
10	Чипсы ОНЕГА из сырого картофеля со вкусом сметаны с луком 75 г
11	Чипсы ОНЕГА из сырого картофеля со вкусом мяса на углях 75 г
12	Чипсы ОНЕГА из сырого картофеля с морской солью 75 г
13	Чипсы ОНЕГА из сырого картофеля со вкусом сыра 75 г
14	Чипсы рифленые ОНЕГА из сырого картофеля со вкусом сметаны и зелени 75 г
15	Чипсы рифленые ОНЕГА из сырого картофеля со вкусом стейка на гриле 75 г
16	Чипсы из сырого картофеля ОНЕГА со вкусом краба, 140 г
17	Чипсы из сырого картофеля ОНЕГА со вкусом сметаны с луком, 140 г
18	Снеки ОНЕГА со вкусом лука со сметаной 110 г
19	Снеки ОНЕГА со вкусом пекинской утки 110 г
20	Снеки ОНЕГА со вкусом сыра 110 г
21	Снеки ОНЕГА Луковые колечки со вкусом сметаны 130 г
22	Снеки ОНЕГА Луковые колечки со вкусом паприки 130 г
23	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом сметаны с луком 180 г
24	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом курицы гриль, 180 г
25	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом грибов в сливочном соусе, 180 г
26	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом сметаны и лука 90 г
27	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом сыра 90 г
28	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом курицы гриль 90 г
29	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом баварских колбасок 90 г
30	Чипсы ОНЕГА пластинки со вкусом сыра со сметаной, 90 г
31	Чипсы ОНЕГА пластинки с чесноком 90 г
32	Чипсы ОНЕГА пластинки с укропом 90 г
33	Арахис ОНЕГА Крепкий орешек жареный соленый 90 г
34	Чипсы из сырого картофеля ОНЕГА со вкусом сметаны с луком 150 г
35	Чипсы из сырого картофеля ОНЕГА со вкусом краба 150 г
36	Арахис ОНЕГА Крепкий орешек жареный соленый 120 г
37	Пюре картофельн. ОНЕГА со вкусом курицы (пакет) 38 г
38	Пюре картофельн. ОНЕГА со вкусом говядины 38 г
39	Пюре картофельное ОНЕГА со вкусом лисичек 38 г
40	Малина ФЕРМА свежая 125 г
41	Голубика ФЕРМА свежая 125 г
42	Ежевика ФЕРМА свежая 125 г
43	Чайный напиток ФЕРМА «Добры ранак» 20 г
44	Чайный напиток ФЕРМА «Иван-Чай с мятой» 20 г
45	Чайный напиток ФЕРМА «Водар лета» 20 г
46	Мед натуральный ФЕРМА гречишный (ст/б.) 350 г
47	Мед натуральный ФЕРМА липовый (ст/б.) 350 г
48	Пастила фруктовая ФЕРМА «Микс всех вкусов» 50 г
49	Пастила фруктовая ФЕРМА «Лесная ягода» 50 г
50	Пастила фруктовая ФЕРМА «Яблоко-Клубника» 50 г
51	Пастила фруктовая ФЕРМА «Яблоко-Малина» 50 г
52	Продукт из шпика Грудинка ФЕРМА «Деревенская» охлажд. соленая
53	Продукт из шпика ФЕРМА Грудинка «По-крестьянски» соленая
54	Продукт из свинины ФЕРМА Филей «Праздничный люкс» мясной соленый
55	Продукт из свинины ФЕРМА Шейка «По-славянски люкс» мясной соленый
56	Продукт из свинины ФЕРМА Окорок «Вясковы люкс» мясной соленый
57	Продукт из свинины ФЕРМА Корейка «Вясковая люкс» мясной соленый
58	Продукт из шпика ФЕРМА «Сало По-Белорусски» соленое охл.
59	Мясо птицы. Крыло индейки ФЕРМА охлажд. (в/у)
60	Мясо птицы. Голень индейки ФЕРМА охлажд. (в/у)
61	Филе индеек ФЕРМА охлажд. (в/у)
62	Продукты разделки и обвалки мяса птицы. Мякоть бедра индеек ФЕРМА (в/у)
63	Наборы из продуктов разделки и обвалки мяса птицы. Набор для супа из индеек ФЕРМА охлажд. (в/у)
64	Продукты разделки и обвалки мяса птицы. Кожа индеек ФЕРМА охлажд. (в/у)
65	Полуфабрикат из свинины ФЕРМА «Тазобедренная часть свиная в шкуре» мясной натуральный крупнокусковой бескостный охлажд. (в/у)
66	Полуфабрикат из свинины ФЕРМА «Шейная часть свиная» мясной натуральный крупнокусковой бескостный охлажд. (в/у)
67	Полуфабрикат из свинины ФЕРМА «Грудинка свиная бескостная» мясной натуральный крупнокусковой бескостный охлажд. (в/у)
68	Полуфабрикат из свинины ФЕРМА «Реберные пластины свиные» мясной натуральный крупнокусковой мясокостный охлажд. (в/у)
69	П/ф из свинины ФЕРМА «Полуфабрикат свиной для натуральных отбивных котлет в шкуре» мясной натур. крупнок. бескост. охлажд. (в/у)
70	Полуфабрикат из свинины ФЕРМА «Полуфабрикат свиной для паляндвицы» мясной натуральный крупнокусковой бескостный охлажд. (в/у)
71	Продукт из шпика ФЕРМА Шпик хребтовый несоленый охлажд.
72	Полуфабрикат из свинины ФЕРМА «Лопаточная часть свиная в шкуре» мясной натуральный крупнокусковой бескостный охлажд. (в/у)
73	Картофель ФЕРМА (фас. сетка)
74	Капуста белокачанная ФЕРМА (фас. в термопленку)
75	Капуста краснокачанная ФЕРМА (фас. в термопленку)
76	Свекла столовая ФЕРМА (фас. сетка)
77	Лук ФЕРМА репчатый (фас. сетка)
78	Лук ФЕРМА красный репчатый (фас. в термопленку)
79	Лук ФЕРМА белый репчатый (фас. в термопленку)
80	Морковь ФЕРМА (фас. сетка)
81	Тыква ФЕРМА (фас. в термопленку)
82	Томат сливка ФЕРМА (фас. подложка)
83	Кукуруза ФЕРМА (фас. в термопленку)
84	ФЕРМА Бастурма из мяса лося
85	Колбаса из мяса бобра ФЕРМА «Деликатесная Люкс» вяленая
86	Колбаса ФЕРМА «Деликатесная» с клюквой вяленая
87	Колбаса ФЕРМА «Куриная Люкс» вяленая
88	Колбаса ФЕРМА «Домашняя» классическая с тмином вяленая
89	Колбаса ФЕРМА «Куриная» вяленая
90	Колбаса ФЕРМА «Лосиная» вяленая
91	Колбаса ФЕРМА «Охотничья» вяленая
92	Колбаса ФЕРМА «Чоризо» вяленая
93	Колбаса из индейки ФЕРМА вяленая
94	Колбаса из мяса лося ФЕРМА с кедровыми орехами вяленая
95	Колбаса из мяса оленя ФЕРМА вяленая
96	Полуфабрикат мясной из баранины ФЕРМА «Шашлык из баранины» мелкокусковой бескостный (охл.) в/у
97	Полуфабрикат мясной ФЕРМА «Колбаски из баранины» мелкокусковой бескостный рубленый (охл.) в/у
98	Полуфабрикат мясной из кролика ФЕРМА «Ножки кролика по-провански» крупнокусковой мясокостный (охл.) в/у
99	Полуфабрикат из мяса цыплят-бройлеров ФЕРМА «Цыпленок табака по-грузински» крупнокусковой мясокостный (охл.) в/у
100	Полуфабрикат из мяса утки ФЕРМА «Фруктовая утка» крупнокусковой мясокостный (охл.) в/у
101	Полуфабрикат мясной из баранины ФЕРМА «Ножка ягненка по-кавказски» крупнокусковой мясокостный (охл.) в/у
102	Полуфабрикат из мяса перепелки ФЕРМА «Перепелка в лимонном соусе» крупнокусковой мясокостный в маринаде (охл.) в/у
103	Продукт из свинины ФЕРМА «Бастурма По-кавказски» мясной мякотный цельнокусковой с/в (вак. полим. пленке)
104	Сок ФЕРМА яблочный прямого отжима пастеризованный Bag in Box 3 л
105	Мята ФЕРМА «Перечная» 30 г
106	Салат Руккола ФЕРМА 50 г
107	Шпинат «Пума» ФЕРМА 50 г
108	Прод. разд. и обв. мяса птицы. Мясо беск. куск. груд. части утят ФЕРМА «Стейк утиный» (охл.) (лоток, мод. газ. ср.)
109	Мясо птицы. Окорочок утенка ФЕРМА (охл.) (лоток, мод. газ. ср.)
110	П/ф нат. из мяса пт. для пит. детей дошк. и шк. возр. мясок. Бедро цыпленка ФЕРМА (охл.) (лоток, мод. газ. ср.) 600 г
111	П/ф нат. из мяса пт. для пит. детей дошк. и шк. возр. мясок. Голень цыпленка ФЕРМА (охл.) (лоток, мод. газ. ср.) 600 г
112	П/ф нат. из мяса пт. для пит. детей дошк. и шк. возр. мясок. Кусковое мясо бедра цыпленка ФЕРМА (охл.) (лоток, мод. газ. ср.) 600 г
113	П/ф нат. из мяса пт. для пит. детей дошк. и шк. возр. мясок. Филе грудной части цыпленка ФЕРМА (охл.) (лоток, мод. газ. ср.) 600 г
114	Мясо птицы. Тушка утенка ФЕРМА (охл.) 1/с потр. (в/у)
115	Мясо птицы. Тушка утенка ФЕРМА (зам.) 1/с потр. (в/у)
116	Прод. разд.и обв. мяса птицы. Плечевая часть крыла тушки ц/б ФЕРМА (охл.) (лоток, мод. газ. ср.) 600 г
117	Конфеты ФЕРМА фруктово-ягодные Яблоко-клубника ХОБА 60 г
118	Конфеты ФЕРМА фруктово-ягодные Яблоко-вишня ХОБА 60 г
119	Конфеты ФЕРМА фруктово-овощные Яблоко-тыква ХОБА 60 г
120	Конфеты ФЕРМА фруктовые Яблоко ХОБА 60 г
121	Сок ФЕРМА яблочно-черноплоднорябиновый прямого отжима пастеризованный Bag in Box 3 л
122	Крем-мед ФЕРМА с мятой 300 г
123	Крем-мед ФЕРМА с ромашкой 300 г
124	Грибы шампиньоны ФЕРМА культивируемые 1 сорт, свежие (фас.) 250 г
125	Грибы шампиньоны ФЕРМА культивируемые 1 сорт (фас.) 500 г
126	Грибы шампиньоны ФЕРМА культивируемые мелкого сорта свежие (фас.) 300 г
127	Грибы шампиньоны ФЕРМА культивируемые Королевские свежие (фас.) 500 г
128	Грибы шампиньоны ФЕРМА культивируемые мелкие Королевские 1 сорт свежие (фас.) 300 г
129	Грибы шампиньоны ФЕРМА культивируемые 1 сорт mix охл. (фас.) 500 г
130	Мясо птицы. Окорочок утки ФЕРМА (охл.) (лоток, мод. газ. ср.)
131	Прод. разд. и обв. мяса птицы. Мясо беск. куск. груд. части уток ФЕРМА «Стейк утиный» (охл.) (лоток, мод. газ. ср.) 380 г
132	Капуста квашеная ФЕРМА (фас.) 0,8 кг
133	Капуста квашеная ФЕРМА с клюквой (фас.) 0,8 кг
134	Кабачок ФЕРМА Урожай 2020 (фас. в термопленку)
135	Кабачок цукини ФЕРМА
136	Картофель ФЕРМА сухая чистка БИОпакет (2 кг)
137	Лук (белый, красный) ФЕРМА репчатый (фас. в термопленку)
